◂ № 45 (268) ◂ 2 снежня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АЛЕГ АРЛОЎ**

Стар. 4

**АСТАПОВІЧУ АД ЛЕАНАРДА**

Пра эскізны праект рэканструкцыі, рэстаўрацыі і аднаўлення правага боку вуліцы Гандлёвай у горадзе Мінску Антон Астаповіч распавядае журналісту «НЧ» Марату Гаравому

Стар. 6

**ШКІЛЕТ У КАРАЛЕЎСКАЙ ШАФЕ**

Чарговы скандал разгарэўся вакол брытанскай каралеўскай сям'і. Каралева Елізавета доўгі час хавала ад грамадскасці псіхічна хворых пляменніц, якія амаль усё жыццё правялі ў ізаляцыі

Стар. 12

**ДРАЎЛЯНЫ НАРОД**

Стар. 15

ISSN 2218-2144

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**ДА НОВАГА ГОДА МОЖНА ПАСПЕЦЬ ПАДПІСАЦЦА НА «НОВЫ ЧАС» ПА СТАРЫХ КОШТАХ!**

▸ **ПРЫСУД**

# ЯК З ГЭТЫМ ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ?

Вольга ХВОІН

**Вынесены вердыкт Вярхоўнага суда па першай у гісторыі незалежнай Беларусі справе аб тэрарызме. Вышэйшая мера пакарання — расстрэл абодвум абвінавачаным.**



30 лістапада першы намеснік старшыні Вярхоўнага суда Беларусі Аляксандр Федарцоў агучыў смяротны прысуд Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву. Яны абвінавачаныя ў выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая» 11 красавіка 2011 года. Тады загінула 15 чалавек, больш за 200 былі шпіталізаваныя. Таксама Канавалаў і Кавалёў абвінавачаныя ў выбухах у Мінску ў 2008 годзе і ў Віцебску ў 2005 годзе.

Суд прызнаў Канавалава вінаватым у выбуху ў Мінску ў 2008 годзе, і ў сталічным метро ў 2011 годзе. Кавалёў, паводле матэрыялаў справы, ведаў пра гэтыя факты і не паведаміў кампетэнтным органам. А таксама, калі Канавалаў прыязджаў у Мінск, каб арганізаваць выбух у метро, дапамагаў яму несці сумку з выбухоўкай, здымаць кватэру. У выніку суд прыгаварыў абвінавачваемых да вышэйшай меры — расстрэлу.

Але, нягледзячы на агучаныя судом факты, вердыкт «да вышэйшай меры пакарання» быў вельмі неадназначна ўспрыняты людзьмі, што прыйшлі ў суд. Пасяджэнне адбывалася ў актавай зале Дома правасуддзя, разлічанай на пяцьсот чалавек, і яна была амаль поўная.

Людзі крычалі пра судзілішча, пра 1937 год, крычалі Канавалаву, каб той урэшце загаварыў, бо на судовым працэсе ён адмовіўся даваць паказанні, адмовіўся і ад свайго апошняга слова. Канавалаў так нічога і не сказаў. Кавалёў у часе пасяджэння хіба толькі жэстам паказаў, каб людзі маўчалі, калі ў часе зачытвання вердыкту ў залі пачаліся наракапні.

Рашэнне Вярхоўнага суда можа быць абскарджанае толькі ў парадку нагляду. Але асуджаныя да вышэйшай меры пакарання могуць пісаць прашэнне аб памілаванні на імя Аляксандра Лукашэнкі.

Адвакат Канавалава Дзмітрый Лепрэтар мае намер бліжэйшым часам сустрэцца са сваім падабаронным, каб абмеркаваць далейшыя дзеянні: ці будзе падавацца скарга ў парадку нагляду, ці будзе яго падабаронны пісаць прашэнне аб памілаванні.

Маці Уладзіслава Кавалёва сказала, што лічыць гэты прысуд сфабрыкаваным. Яна будзе пісаць прашэнне аб памілаванні да Лукашэнкі. Яшчэ ў панядзелак, 28 лістапада, на адмысловай прэсавай канферэнцыі маці Кавалёва агучыла свой зварот да Лукашэнкі. «Не ведаю, ці пачуеце вы гэты зварот, або ад вас зноў схаваюць праўду. Не дайце пазбавіць жыцця сыноў, чыя вінаватасць выклікае вялікі сумнеў. Я заклікаю вас сказаць сваё апошняе слова: правесці дадатковае і стараннае расследаванне гэтай справы. Не спяшацца з вынясеннем рашэння, падумаць. Я гатова ахвяраваць сабой. Я гатова да таго, каб расстралялі мяне замест майго сына. У нас няма права на памылку. На месцы майго сына мог апынуцца любы чалавек», — сказала жанчына.

Маці Кавалёва перакана588, што яе сын і Дзмітрый Канавалаў не рабілі гэтага злачынства.

«Дарагія людзі, я адчуваю боль ад страты блізкіх і перанесеных пацярпелымі раненняў. Я жыву з вамі на адной беларускай зямлі і прашу ў вас прабачэння, што вам давялося перажыць. Але паверце мне: ні мой сын — Улад, ні Дзіма Канавалаў не з'яўляюцца віноўнікамі гэтага жудаснага злачынства. Пасля суда і следства на чашу былі пастаўленыя так званыя прызнанні Дзімы, якія былі атрыманыя ў пешыя дні папярэдняга следства падчас допытаў без адвакатаў. Як здабываюцца такія паказанні, мы ўсе ведаем. Дзіма быў моцна збіты, аб гэтым сведчыў і Улад, і дзяўчына, што была з імі, — Яна Пачыцкая. І калі сёння нехта яшчэ не разумее, што адбываецца вакол нас, і хоча запатрабаваць дадатковай нявіннай крыві да тых пятнаццаці ахвяраў, я гатовая ахвяраваць сабой», — сказала Любоў Кавалёва падчас адмысловай прэс-канферэнцыі.

Яна распавяла, што менавіта ў часе судовага працэсу маці другога абвінавачанага Дзмітрыя Канавалава замкнулася ад людзей. «Мы кантактавалі, і да суда, і падчас следства я хадзіла да яе. Мама Дзімы да суда сапраўды была мамаю — яна плакала, перажывала. Але што здарылася пасля таго, як пачаліся судовыя слуханні? Яна не прыехала. Я пайшла да яе, і пабачыла іншага чалавека — запалоханага. Ёй было вельмі цяжка размаўляць. Думаю, нешта ёй сказалі, не дарэмна яна так стала паводзіцца ў адносінах да Дзімы, да мяне», — распавяла Любоў Кавалёва.

Пацярпелы Самвел Саакян прымаў актыўны ўдзел у працэсе, наведваў пасяджэнні, выступаў з крытыкай і заўвагамі. Але вырак суда каментаваць адмовіўся. «Уражанні як і ва ўсіх», — толькі і сказаў пацярпелы.

На адмысловым сайце ў інтэрнэце сабрана больш за 45 тысяч подпісаў пад петыцыяй у абарону Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва. Маці Улада Кавалёва таксама збірае подпісы ў абарону свайго сына.

Людзі, што прысутнічалі на апошнім пасяджэнні, абураліся вердыктам, некаторыя заклікалі звярнуцца за дапамогай да расійскага кіраўніцтва. Некаторыя гаварылі, што вердыкт суда правільны. Але ці не большая частка прысутных пакінулі залю з цяжкімі думкамі і нявер'ем у тое, што да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу — прыгавораныя несапраўдныя злачынцы.

Паводле міжнароднай праваабарончай арганізацыі Amnesty International, ад 1991 года ў Беларусі пакаралі смерцю каля 400 чалавек. У Беларусі афіцыйна не публікуюцца статыстычныя дадзеныя пра колькасць вынесеных і прыведзеных у выкананне смяротных прысудаў. Дата смерці не паведамляецца родным, целы не выдаюцца для пахавання. Прэцэдэнт справы Канавалава і Кавалёва, відаць, даў зразумець як мінімум некальким сотням людзей, што прысутнічалі ў часе абвяшчэння выраку, што смяротная кара — гэта не расплата і не помста. Нават у насамрэч праваовай дзяржаве яна далучае да гэтага акту мноства іншы людзей, робіць іх саўдзельнікамі яшчэ аднаго злачынства — смерці чалавека.

Праваабаронцы і грамадскія дзеячы асудзілі гэты жорсткі вырак. Галоўная прэтэнзія ў тым, што доказная база па справе не была пераканаўчай. «Проста коціцца наша краіна да нейкага стану… не хачу застрашваць… Але што адбываецца, не ўкладваецца ні ў рамкі маралі, ні ў рамкі судовай вытворчасці. Гэта варварства, каб некага распяць, даць натоўпу костку. Але як з гэтым жыць далей, я не ведаю», — заявіла пасля вердыкту праваабаронца Людміла Гразнова.

P.S.: Усе матэрыялы рэчавай доказнай базы, апроч відэазапісаў, паводле рашэння суда, мусяць быць знішчаныя.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### КАВАЛЕНКУ ЗНОЎ БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ

**5 снежня будуць судзіць віцебскага актывіста Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ Сяргея Каваленку. Пра гэта паведаміла яго маці Лідзія Каваленка.**

24 лістапада каля 20 гадзін Сяргей Каваленка быў затрыманы ў сябе дома супрацоўнікамі РАУС Першамайскага раёна Віцебску. Яны заявілі, што Каваленка здзейсніў адміністрацыйнае правапарушэнне — нібы ён аблаяў мацюком супрацоўнікаў міліцыі. Да панядзелка, 28 лістапада, Каваленка знаходзіўся ў ізалятары часавага ўтрымання ў Віцебску.

Як паведаміла Лідзія Каваленка, 28 лістапада яе сына павінны былі судзіць. «Аднак ён запатрабаваў адваката. Для таго, каб ён змог скласці дамову з адвакатам, яго выпусцілі да 5 снежня», — сказала маці актывіста.

Яна лічыць, што яе сына затрымалі ў сувязі з яго палітычнай актыўнасцю. «Улады Віцебску баяцца, каб ён яшчэ раз не вывесіў дзе-небудзь бела-чырвона-белы сцяг. Цяпер па вечарах цёмна, і Сяргею ўжо прапанавалі напісаць паперу пра тое, што ён абавязаны з'яўляцца дахаты не пазней 19.30. Такую паперу ён пісаць адмовіўся, паколькі інакш ён проста фізічна не паспяваў бы даехаць з працы дахаты да гэтага тэрміна. Магчыма, міліцыя помсціць за гэта», — сказала Лідзія Каваленка.

**Паводле сайта «Народныя навіны Віцебска»**

### КРОК У ЕЎРОПУ

**29 лістапада ў Брэсце адбыўся круглы стол пад назвай «Крок у Еўропу!», прысвечаны абмеркаванню вынікаў аднайменнага праекта.**

Ініцыятарамі і арганізатарамі правядзення мерапрыемства выступілі брэсцкія актывісты грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!». Таксама ў круглым стале прынялі ўдзел прадстаўнікі брэсцкіх арганізацый АГП, БСДП (Грамада), «Маладыя дэмакраты!»

Удзельнікі падвялі прамежкавыя вынікі праекта, у прыватнасці, былі агучаны наступныя дадзеныя: з пачатку рэалізацыі праекта (30 жніўня 2011 года), было сабрана 2242 подпісы пад зваротам у Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт і Брэсцкі гарадскі савет дэпутатаў з просьбай пра садзейнічанне ў рэалізацыі на практыку Закона РБ «Пра ратыфікацыю Дамовы паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Польшча пра правілы прымежнага руху».

Таксама актывістамі былі пададзены тры заяўкі на правядзенне пікетавання з мэтай інфармавання грамадзян пра мэты дадзенага праекта, якія не былі здаволены Брэсцкім гарвыканкамам. У мэтах інфармавання берасцейцаў пра задачы праекта, актывісты выдавалі тэматычныя бюлетэні і флаера.

Напярэдадні круглага стала актывісты кампаніі «Гавары праўду» правялі інфармацыйную акцыю ў трох месцах абласнога цэнтра, падчас якой, жыхарам горада было раздадзена больш 2000 флаераў «Крок у Еўропу!». У акцыі прынялі ўдзел 10 чалавек, яна доўжылася больш за паўтары гадзіны.

**Паводле сайта «Віртуальны Брэст»**

### ЮБІЛЕЙНАГА НЕ БУДЗЕ

**Самы першы ў Гомелі кінатэатр, які распачаў паказ фільмаў у фармаце 3D, не вытрымаў гонкі за гледачом.**

Апошні фільм «Мушкецёры 3D» кінатэатр «Юбілейны» прадэманстраваў гледачам 16 лістапада ў 20.10. Як распавядаюць супрацоўнікі ўстановы, у апошнія месяцы працы было складана сабраць нават палову залы, тады як для паспяховай працы патрабавалася прысутнасць хаця б трох сотняў кліентаў на кожным сеансе.

Некалькі гадоў таму ГДУ ім.Ф. Скарыны сам кінатэатр здаў у арэнду ПУП «Інвестыцыйная кампанія «Капітал-актыў». У мадэрнізацыю кінатэатра яшчэ ў 2008 годзе былі ўкладзены велізарныя грошы. Ён набыў новую гукавую сістэму, 21-метровы бясшоўны экран. Усё абсталяванне закуплялася ў Еўропе, а папкорніцы, пагаворваюць, везлі нават з Нью-Ёрка.

Квіткі на сеанс, усталяваныя адразу пасля адкрыцця, шмат каго напалохалі. Да таго ж размешчаны кінатэатр у досыць невыгодным месцы. Раён па ўзроставым паказчыку пажылы, грамадскім транспартам наўпрост да «Юбілейнага» праехаць цяжкавата, але ў любым выпадку пэўнай папулярнасцю ў гледачоў ён карыстаўся.

**Паводле газеты «Вячэрні Гомель»**

### ПОРНА ЗАМЕСТ САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТАК

**Адміністратар адной з дзяржаўных арганізацый у Гародню распавёў пра лісты, якія прыйшлі ад «Белтэлекама» ва ўсе раённыя філіялы і галаўны офіс. У лісце сказана, што патрабуецца змяніць DNS-запісы на кампутарах арганізацыі.**

«У выпадку выкарыстання ў сеткавых наладках іншых IP-адрасоў DNS-сервераў, РУП «Белтэлекам» не нясе адказнасць за няякаснае падаванне паслуг доступу ў сетку інтэрнэт ці поўную іх адсутнасць».

Пасля тэставання новых DNS стала ясна, што заблакаваны сайты з «чорнага» спісу, некаторыя з якіх «засвяціліся» ў інтэрв'ю афіцыйных асобаў. Пры гэтым выкарыстанне такіх DNS блакуе доступ да сацыяльных сетак (нават YouTube), затое некаторыя сайты з порна-кантэнтам працягваюць звычайна адкрывацца. ICQ і Skype працуюць.

DNS (англ. Domain Name System) — размеркаваная сістэма для атрымання інфармацыі пра дамены. Часцей за ўсё выкарыстоўваецца для атрымання IP-адраса па імені хоста (кампутара ці прылады), атрымання інфармацыі пра маршрутызацыю пошты, пра абслугоўваючыя вузлы для пратаколаў у дамене.

**Паводле сайта «Блог Гродна s13»**

---

ЗАКЛІК

## НЕ — СМЯРОТНЫМ ПРЫСУДАМ!

**Германскі ўпаўнаважаны па правах чалавека Маркус Лёнінг патрабуе адмовіцца ад смяротнага пакарання ў Беларусі.**

«Я асуджаю смяротныя прысуды, якія былі вынесены Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву, і патрабую змяніць іх на турэмнае зняволенне, — сказаў Лёнінг. — Абодва асуджаныя абвінавачваюцца ў цяжкіх злачынствах. Я спачуваю ахвярам страшнага выбуху ў мінскім метро і іх сем'ям. Аднак Федэральны ўрад па прынцыповых меркаваннях выступае супраць смяротных прысудаў».

«Смяротная кара ніколі не апраўдана, — падкрэсліў дыпламат. — Яна не з'яўляецца адэкватным сродкам — ні ў якасці пакарання, ні ў барацьбе са злачыннасцю. Ніколі не магчыма выключыць судовыя памылкі. Таму я заклікаю беларускі ўрад да неадкладнай адмены смяротнага пакарання, а ў якасці першага кроку — абвясціць мараторый на прывядзенне ў выкананне смяротных прысудаў.

«Смяротныя прысуды — адзін з пунктаў у доўгім пераліку парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі. Заклікаю беларускія ўлады да таго, каб яны нарэшце паважалі правы чалавека і грамадзянскія правы», — сказаў упаўнаважаны па правах чалавека Маркус Лёнінг.

**Паводле інфармацыі пасольства ФРГ**

---

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ЧАРГОВЫЯ ДОПЫТЫ

**Юрась Меляшкевіч, сябра Сойму Партыі БНФ і кіраўнік мінскага гарадскога аддзялення Руху «За Свабоду», 30 лістапада быў дапытаны ў Цэнтральным РАУСе Мінска па справе фронтаўцаў — Алеся Каліты, Сяржука Семянюка і Максіма Губарэвіча, якія падазраюцца паводле артыкула Крымінальнага кодэксу «хуліганства, здзейсненае групай асобаў».**

Паводле Юрася Меляшкевіча, следчая Аксана Запаснік парушыла Крымінальна-працэсуальны кодэкс РБ і перад допытам не зачытала ягоных правоў. Юрась адмовіўся падпісваць пратакол, у выніку чаго быў дапытаны другі раз і на руках у следчай аказалася два пратаколы. «Я падпісаў першы пратакол, дзе адсутнічаў раздзел азнаямлення мяне з маімі правамі і абавязкамі, у другім пратаколе я напісаў, што ў сувязі з тым, што следчая не выканала ўсе працэсуальныя дзеянні правільна, я даў паўторныя паказанні. Таксама звярнуў увагу, што фармальнае вядзенне следства ўказвае на палітычную матывацыю справы. Гэта ёсць у пратаколе», — расказвае Юрась Меляшкевіч.

Як лічаць самі фігуранты справы, папярэдняе следства ўжо заканчваецца і ў хуткім часе справа будзе перададзеная ў пракуратуру. На гэтым тыдні праводзяцца допыты сяброў Сойму, якія былі прысутныя на пасяджэнні 13 жніўня.

Прэс-служба Партыі БНФ нагадвае, што інцыдэнт здарыўся ў жніўні, ля офісу ПБНФ у Мінску на вуліцы Крапоткіна 93А. Пасля звароту аднаго служачага ў міліцыю, тром сябрам Сойму БНФ пагражае пазбаўленне волі да шасці гадоў паводле артыкула Крымінальнага кодэксу «хуліганства, здзейсненае групай асобаў». Сярод падазраваных у справе: Максім Губарэвіч, Сяржук Семянюк і Алесь Каліта.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду»**

---

ДАПАМОГА

## ЕС ФІНАНСУЕ ЗНІШЧЭННЕ МІН

**Па выніках тэндэру іспанская кампанія EXPAL Systems атрымала замову на знішчэнне прыблізна 3 400 000 змешчаных у Беларусі супрацьпяхотных мін. Выдаткі па кантракце, якія складуць 3 900 000 еўра, цалкам пакрывае Еўрасаюз.**



Далучыўшыся ў верасні 2003 года да Канвенцыі пра забарону на прымяненне, назапашванне, вытворчасць і перадачу супрацьпяхотных мін і пра іх знішчэнне, таксама вядомай як Атаўская дамова, Беларусь узяла на сябе абавязанне па знішчэнні сваіх запасаў супрацьпяхотных мін на працягу чатырох гадоў. Еўрапейскі саюз зацікаўлены ў тым, каб Беларусь выканала ўзятыя на сябе абавязкі.

У рамках праекта EXPAL Systems будзе адказваць за:

— стварэнне аб'екта па знішчэнні супрацьпяхотных мін на базе, размешчанай поруч г. Рэчыца; аб'ект павінен адпавядаць стандарту NATO AASTP–1;

— прадстаўленне абсталявання, якое дазволіць камандзе, якая здзяйсняе праект, назіраць, кантраляваць працэс знішчэння супрацьпяхотных мін у фармаце рэальнага часу і дакладваць пра ход гэтага працэсу;

— поўнае знішчэнне боепрыпасаў серыі PFM–1 і PFM–1 S;

— забеспячэнне экалагічнай апрацоўкі вадкіх і газападобных адыходаў, што ўтвараюцца падчас знішчэнні супрацьпяхотных мін.

Будаўніцтва аб'екта, на якім будзе ажыццяўляцца знішчэнне, пачалося 20 кастрычніка. Усе працы будуць праводзіцца на тэрыторыі Беларусі, і іх плануецца завяршыць да мая 2013 года.

**Для даведкі:**

EXPAL Systems — кампанія, якая займаецца вытворчасцю, распрацоўкай і інтэграцыяй сістэм і паслуг у сферы абароны і бяспекі, у тым ліку абясшкоджваннем састарэлых, непатрэбных ці забароненых боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. EXPAL — гэта падраздзяленне MAXAM Group, якое спецыялізуецца на абаронным сектары. MAXAM мае вытворчыя цэнтры ў больш за сарока краінах і карыстаецца паслугамі шасці тысяч прафесіяналаў.

**Паводле DELEGATION BELARUS PRESS**

---

ЛІСТ

## ПРЫНЯТЫ ДА ВЕДАМА

**Каардынатар кампаніі «Права на веру» Аляксей Шэін і кіраўнік Выканаўчага бюро Асамблеі НДА Сяргей Лісічонак атрымалі ліст з Палаты прадстаўнікоў.**

Старшыня камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай камунікацыі А.М. Юшкевіча, выказваюць падзяку за накіраваны ім пераклад Заключэння Еўрапейскай Камісіі за дэмакратыю праз права (Венецыянскай камісіі) датычна адпаведнасці артыкула 193.1 КК РБ міжнародным стандартам правоў чалавека ў адносінах да правоў незарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў. Паводле старшыні камісіі, «дакумент прыняты да ведама і будзе выкарыстоўвацца дэпутатамі ў працы».

У заключэнні гаворыцца, што артыкул 193.1 парушае Міжнародны пакт аб палітычных і грамадзянскіх правах і з'яўляецца патэнцыйным інструментам для дзяржавы ў стрымліванні грамадскіх актывістаў, дае ўладам шырокія паўнамоцтвы ўмешвацца ў фундаментальнае права на свабоду асацыяцыяў, свабоду думкі, перакананняў і іх выражэння.

**Прэс-служба Асамблеі НДА**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДАТЭРМІНОВЫ ПАРЛАМЕНТ?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Парламенцкія выбары ўсё бліжэй і бліжэй. Нават нягледзячы на тое, што да іх застаецца амаль год. Тэму падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў абмеркавалі 28 лістапада Аляксандр Лукашэнка і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Рубінаў.**

«Гаворка ішла пра тое, што кандыдатамі ў дэпутаты павінны стаць найбольш актыўныя грамадзяне, хто добра ведае сітуацыю на месцах, умее смела адстойваць сваю пазіцыю, вылучаць прапановы, ініцыятывы, хто сапраўды клапоціцца пра выгаду народа. Парламенцкія выбары павінны прайсці на высокім узроўні, і павінен быць сфарміраваны дзеяздольны парламент, які будзе працаваць на карысць нашага грамадства і дзяржавы», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы прэзідэнта.

Што гэта азначае? Можа, сапраўды тое, што да выбараў застаецца менш года? Не так даўно расійская газета «Коммерсант» вылучыла версію, што парламенцкія выбары ў Беларусі будуць перасунутыя з восені на вясну 2012 года. Афіцыйныя структуры гэтую версію абверглі. Але ўся логіка падзеяў кажа пра тое, што да выбараў рыхтавацца трэба ўжо вясной.

Інакш навошта сустракацца з Рубінавым?

Здаецца, гэта асэнсоўваюць і самі прадстаўнікі парламента. «Пройдзены шлях пераканаўча даказвае, што беларускі парламент годна выконвае ўскладзеную на яго місію», — заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, выступаючы 28 лістапада ў парламенце з нагоды 15-годдзя стварэння ніжняй палаты.

Андрэйчанка асабліва адзначыў, што каля вытокаў сучаснага беларускага парламентарызму стаяў Аляксандр Лукашэнка, які «аб'ядная і накіраваў намаганні ўсіх галін улады на рэалізацыю волі народа, увасобленай у рашэннях усебеларускіх народных сходаў».

Спікер Палаты прадстаўнікоў сказаў, што на працягу 15-гадовага перыяду «дэпутаты былі ў гушчы падзей, удзельнічалі ў вырашэнні праблем, якія стаяць перад краінай». «Вядома, нашу працу нельга вымераць арыфметычна, але лічбы гавораць самі за сябе. За 15 гадоў прынята больш за паўтары тысячы законаў. Праведзена практычна поўная кадыфікацыя нацыянальнага заканадаўства: прынята 26 кодэксаў. Сфармаваная заканадаўчая база ахоплівае ўсе бакі жыцця беларускага грамадства і дзяржавы», — сказаў ён.

Андрэйчанка таксама заявіў, што, «прасоўваючы інтарэсы Беларусі на міжнароднай арэне, фармуючы пазітыўны імідж краіны ў вачах замежных палітыкаў і міжнароднай грамадскасці, парламентарыі ўносяць сваю лепту ў стварэнне спрыяльных знешніх умоў для стабільнага развіцця беларускай дзяржавы».

Хутчэй за ўсё, гэта своеасаблівая «эпітафія» сённяшняму складу парламента. Па ідэі, для парламента засталося яшчэ адно скліканне — увесну 2012 года. Але тое, што спікер парламента ўжо кажа пра вынікі, паказальна. Значыць, новага склікання можа і не быць.

А тым часам Беларусь працягвае падаць у фінансавую дзіру. Не паспелі ўзрадавацца, што нам газ будзе па ніжэйшым кошце, дык Расія ахаладзіла «гарачыя галовы». Да канца гэтага года Беларусь і Расія не дамовяцца аб прэміі на нафту, заявіў пасол РФ у Мінску Аляксандр Сурыкаў на прэс-канферэнцыі ў Мінску 30 лістапада.

Паводле яго слоў, у перамовах па гэтым пытанні бакі знаходзяцца кожны на сваёй пазіцыі. Адна з прычын у тым, што выдаткі нафтавых кампаній Расіі ў частцы здабычы нафты надзвычай высокія, адзначыў пасол. «Расійскія кампаніі здабываюць нафту, можа быць, нават у больш складаных умовах, чым у Беларусі», — сказаў Сурыкаў. У сувязі з гэтым, дадаў ён, частку сваіх затрат яны перадаюць беларускаму боку — «каб ураўнаважыць бізнэс».

> А тым часам Беларусь працягвае падаць у фінансавую дзіру. Не паспелі ўзрадавацца, што нам газ будзе па ніжэйшым кошце, дык Расія ахаладзіла «гарачыя галовы»

Зараз беларускія кампаніі за адну тону імпартаванай нафты плацяць расійскім прэмію ў 45 долараў. Беларускі бок настойвае на зніжэнні прэміі прыкладна да 20 долараў.

Сурыкаў, збольшага, як дыпламат, умоўчвае адно. Тое, колькі здабываюць нафты расійскія кампаніі, і колькі здабываецца нафты ў Беларусі.

Сурыкаў нават не выключае ўзнікнення спрэчак паміж краінамі пры фарміраванні Еўразійскага саюза.

«Не выключаю спрэчак, таму што там вельмі далікатныя пытанні будуць закранутыя, бо гэта перадача часткі суверэнітэту кожнай краіны», — сказаў дыпламат. Пры гэтым ён падкрэсліў, што любыя супярэчнасці і рознагалоссі павінны вырашацца «дыпламатычным шляхам, без выхаду ў прамыя эфіры».

Адказваючы на пытанне журналістаў, ці не пагоршацца ў будучыні расійска-беларускія адносіны, якія цяпер перажываюць уздым, ён адказаў: «Не магу сказаць, што ў нас усё закончылася вялікай любоўю (пасля правядзення Вышэйшага дзяржсавета і падпісання шэрагу пагадненняў). Мы проста робім абсалютна прагматычна і спрабуем аднавіць большую частку савецкага рынку», — сказаў Сурыкаў.

А пакуль «абсалютна прагматычна» рэагуе Расія на падзеі ў Беларусі, Польшча рэагуе на іх не прагматычна, а згодна з сумленнем.

«Польшча возьме ўдзел у кампенсацыі арыштаванай маёмасці беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага», — заявіў міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі 29 лістапада на Форуме грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства ў Познані (Польшча). Так ён пракаментаваў чуткі аб тым, што польскае пасольства ў Мінску нібыта адмовілася браць удзел у выплаце кампенсацыі.

Нагадаем, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, кіраўнік закрытага ўладамі праваабарончага цэнтра «Вясна» Алесь Бяляцкі прыгавораны да чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Такое рашэнне абвясціў 24 лістапада суддзя суда Першамайскага раёна Мінска Сяргей Бандарэнка. Праваабаронца прызнаны вінаватым на падставе часткі 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры).

На прэс-канферэнцыі ў Познані Сікорскі паведаміў, што нядаўна размаўляў з жонкай Алеся Бяляцкага, і Польшча спрабуе дапамагчы яго сям'і — але так, каб не нашкодзіць праваабаронцы і яго блізкім. Паводле слоў кіраўніка МЗС, Польшча асуджае прысуд, вынесены Бяляцкаму. Еўрасаюз, падкрэсліў ён, можа пашырыць спіс неўязных, уключыўшы ў яго адказных за крымінальны пераслед беларускага праваабаронцы.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### КАЦЯРЫНА ВАНДАР'ЕВА



Вечарам 26 лістапада ў культурна-спартыўным комплексе «Мінск–Арэна» адбыўся турнір сусветнага Гран-пры па муай тай «Вялікая васьмёрка». У баі за тытул чэмпіёнкі свету WKN сярод жанчын (да 56,5 кілаграмаў) беларуска Кацярына Вандар'ева перамагла польку Джаану Янджэйчык.

Калі выносіўся судзейскі вердыкт, многія гледачы крычалі: «Польшча! Польшча!» «Людзі, якія так крычалі, — дзеліцца меркаваннем адзін з арганізатараў турніру, галоўны трэнер і дырэктар клуба «Кікфайтар», да якога належыць Кацярына Вандар'ева, заслужаны трэнер Беларусі Яўген Кацельнікаў, — гэта тыя, хто глядзіць у асноўным К–1. Там крыху іншыя патрабаванні, іншыя правілы. Каця выйграла тры раўнды з пяці, чацвёрты раўнд суддзі вызначылі як нічыйны, а ў пятым раўндзе яна крышку саступіла. А ў муай тай ацэньваюцца ў асноўным клінч, удары каленямі, праца першым нумарам — яна ўсё гэта паказала. Так што Каця вартая гэтай перамогі, яна яе заслужыла».

Летась Кацярына Вандар'ева выйграла кубак лепшай спартсменкі чэмпіянату свету, які праходзіў у Тайландзе.

### МІКАЛАЙ ЧАРНАВУС



Індывідуальны прадпрымальнік Мікалай Чарнавус прадэманстраваў недалёкасць і абсурднасць Баранавіцкага гарвыканкама. Спадар Чарнавус падаў у выканкам заяўку з просьбай падыхаць дзве гадзіны ў цэнтры горада, паведамляе Spring96.org.

Гэта стала вядома з ліста за подпісам кіраўніка справамі гарвыканкама. Мікалай Хітрык напісаў Чарнавусу адпаведны ліст, у якім паведамляецца, што Мікалай Чарнавус нібыта парушае сваёй ідэяй арт. 2, 5, 8 Закона «Аб масавых мерапрыемствах», таму гарвыканкам не можа дазволіць дзве гадзіны глыбока дыхаць ля помніка Леніну.

Раней Мікалай Чарнавус прасіў раённыя ўлады перадаць баранавіцкім прадпрымальнікам у арэнду будынак закінутай фермы, але не атрымаў адказу на сваю просьбу. Пасля гэтага ён падаў іншыя заяўкі — на велапрабег супраць бюракратызму і марафонскую хадзьбу з той жа мэтай. Але лагічна атрымаў адказ і на такія заяўкі.

Не так даўно «Еўрарадыё» прыдумала акцыю: разам са сваімі слухачамі адзначыць выпадзенне першага снегу катаннем снегавіка. А каб арганізавацца, планавалі даць аб'яву ў інтэрнэце пра месца і час. Але кіраўнік аддзела ідэалогіі Кіраўскага райвыканкама Андрэй Карпук, да якога звярнуліся па тлумачэнні, сказаў, што і для такога мерапрыемства трэба падаваць афіцыйную заяўку: «Гэта ўжо зборышча. Ужо трэба атрымаць дазвол ад старшыні райвыканкама!»

Мікалай Чарнавус вядомы таксама сваімі дабрачыннымі акцыямі, якія ён ладзіць для пажылых людзей.

### СЯРГЕЙ РУМАС



Віцэ-прэм'ер Сяргей Румас паведаміў, што канцэрн «Белнафтахім» прапануе ўраду ў чарговы раз падвысіць цэны на аўтамабільнае паліва, але пакуль «урад разглядае гэтую прапанову». «Рашэнне пакуль не прынятае, але магу вас запэўніць, што з 1 снежня падвышэння не будзе, — цытуе чыноўніка Радыё Свабода. — Мы не знаходзімся ў замарожанай эканоміцы, вываз паліва адбываецца штодня».

Ад 28 лістапада дзейнічае пастанова ўраду, паводле якой выязджаць за межы Беларусі на адным і тым жа аўтамабілі можна адзін раз на восем дзён. Раней можна было ездзіць не часцей як адзін раз на 5 дзён.

Гэтая пастанова прымалася, «каб узмацніць захады па абмежаванні вывазу з краіны аўтамабільнага паліва і стабілізаваць сітуацыю ў пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу».

«Рэцэпт адзін — паступова прыводзіць цэны ў адпаведнасць з цэнамі нашых бліжэйшых суседзяў», — заявіў віцэ-прэм'ер Сяргей Румас.

Пасля апошняга падвышэння цана на дызельнае паліва ў Беларусі на 38% ніжэйшая, чым у Маскоўскай вобласці Расіі, на 85% ніжэйшая, чым ва Украіне, і ў 2,6 разы ніжэйшая, чым у Літве, Латвіі і Польшчы.

Раней СМІ са спасылкай на крыніцы ў «Белнафтахіме» паведамлялі, што 1 снежня чакаецца чарговае павышэнне цэнаў на паліва на 10%. Сёлета цэны на паліва ў Беларусі павышаліся дзесяць разоў.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# Алег Арлоў: ГРАМАДСТВА ПАВІННА ПРАЧНУЦЦА

**Візіты вядомага расійскага праваабаронца ў Мінск цягам апошняга месяца звязаныя з судовым працэсам па справе старшыні «Вясны» Алеся Бяляцкага. Па збегу абставінаў кіраўнік праваабарончага цэнтра «Мемарыял» на цяперашні момант таксама з'яўляецца ўдзельнікам судовага працэсу па справе «Рамзан Кадыраў супраць Алега Арлова», у якой прэзідэнт Чачні абвінавачвае праваабаронцу ў паклёпе. Пра гэта і шмат пра што іншае з праваабаронцам Алегам Арловым размаўляе журналіст Ірына Пракопчык.**



**Даведка:**

Крымінальная справа па ч. 3 арт. 129 (паклёп) КК РФ супраць старшыні Савета Праваабарончага цэнтра «Мемарыял» Алега Арлова была распачатая 20 кастрычніка 2009 года ў сувязі з тым, што 15 ліпеня гэтага года ў заяве ПЦ «Мемарыял» «Пра забойства Наталлі Эстэміравай» Алег Арлоў усклаў на прэзідэнта Чачэнскай Рэспублікі Рамзана Кадырава адказнасць за забойства супрацоўніцы ПЦ «Мемарыял» на Каўказе. Разгляд справы ў Хамоўніцкім судзе Масквы пачаўся 13 верасня 2010 года. 14 чэрвеня 2011 года быў вынесены апраўдальны прысуд Алегу Арлову. Але 24 чэрвеня прадстаўнік Рамзана Кадырава перадаў у суд апеляцыйную скаргу. 4 і 28 кастрычніка ў Хамоўніцкім судзе праходзіў разгляд апеляцый. Наступныя пасяджэнні прызначаныя на 5, 6 і 8 снежня.

— З Алесем Бяляцкім мы сустракаліся на розных канферэнцыях, семінарах — часта па-за межамі Расіі і Беларусі. Я заўсёды ведаў (і карыстаўся гэтым), што інфармацыя ад праваабарончага цэнтра «Вясна» — гэта найбольш поўная і вельмі дакладная інфармацыя. І для нас, расійскіх праваабаронцаў, вельмі важна, каб разумець сітуацыю ў Беларусі, карыстацца інфармацыяй ад гэтай арганізацыі. Зразумела, я заўсёды паважаў Алеся як кіраўніка арганізацыі, якая здольная працаваць у такіх складаных умовах. Затым, калі ў Маскве праходзіў суд па маёй крымінальнай справе, дзе мяне таксама абвінавачвалі нібыта ў здзяйсненні крымінальнага злачынства, Алесь прыязджаў на мой працэс і ўдзельнічаў у назіранні. Канешне, гэтыя два працэсы непараўнальныя: Алесь — за кратамі, я знаходзіўся і знаходжуся на волі. І тым не менш, для мяне прыемная і вельмі важная такая салідарнасць. І я папрасту лічыў сваім абавязкам ехаць у Мінск, каб быць на працэсе, назіраць самому, сведчыць пра тое, як ён праходзіць, спрыяць прыцягненню ўвагі да гэтага працэсу, перш за ўсё, у маёй краіне, Расіі, і выказаць падтрымку Алесю, яго сябрам і паплечнікам.

Цалкам зразумела, што гэта палітычны працэс. Па шматлікіх прычынах відавочна, што пераследуюць Алеся Бяляцкага менавіта за праваабарончую дзейнасць, грамадскую пазіцыю і грамадскую працу — яго і праваабарончага цэнтра «Вясна», які ён узначальвае. Гэта бачна хаця б з таго, што стала вядома падчас працэсу: трэці дзень практычна скончыўся тым, што Алесь Бяляцкі з-за кратаў прачытаў тры «выдатныя» дакумента з крымінальнай справы. Іх неяк прабуднеў пракурор, калі даследаваў матэрыялы справы, а Алесь Бяляцкі (ён зразумеў, што гэта павінны ведаць людзі на волі) заявіў, што хоча агучыць іх. Ён вельмі выразна прачытаў тры дакументы (з іх зместам можна азнаёміцца на сайце ПЦ «Вясна»: http://spring96.org/be/news/47109), якія выйшлі з КДБ Рэспублікі Беларусь і з якіх вынікае, што гэта справа ініцыявана выключна па звароце намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі на імя намесніка генеральнага пракурора.

З таго ліста выразна вынікае, што паступіў нейкі ананімны данос на праваабарончы цэнтр «Вясна» (аднак мяркую, што пра ананімны данос яны выдумалі, на самай справе ў іх былі нейкія аператыўныя распрацоўкі) пра тое, што нібыта гэты цэнтр займаецца супрацьпраўнай дзейнасцю і фінансуе, як там сказана, радыкальную беларускую апазіцыю са сродкаў, якія нібыта для гэтага паступаюць з-за мяжы на рахункі, адкрытыя сябрамі гэтай арганізацыі. Гэта і ёсць той дакумент, з якога пачалася справа Алеся Бяляцкага. І потым яны могуць казаць што заўгодна, але якое дачыненне мае гэты ліст, які тлумачыць сутнасць дадзенай крымінальнай справы, да нявыплаты падаткаў? Зразумела, тое, што «Вясна» актыўна вядзе працу па абароне правоў грамадзян, выклікае незадаволенасць КДБ. Вось сутнасць.

Далей былі яшчэ два дакументы, якія сыходзяць з КДБ, у тым ліку і дакумент, які наўпрост звязвае цікавасць КДБ да дзейнасці Бяляцкага і праваабарончага цэнтра «Вясна» з падзеямі 19 снежня, калі пачаліся гэтыя шырокія драконаўскія рэпрэсіі ў Беларусі. Зразумела, што і ў дачыненні да праваабаронцаў яны выкарыстоўвалі гэтыя рэпрэсіі ўжываць. Усё. Гэтыя тры дакументы, дакладна і выразна прачытаныя (я разумею, для людзей на волі прачытаныя) Алесем Бяляцкім, абсалютна ставяць кропку ў пытанні, што гэта за працэс. Працэс палітычны.

***— Наколькі частыя ў практыцы «Мемарыяла» палітычна матываваныя справы?***

— На жаль, з такімі справамі даводзіцца сустракацца часта. У Расіі палітычныя рэпрэсіі таксама адбываюцца — але не так, як тут. У Беларусі ўсё гэта больш грубае і прамое, ды менш закамуфляванае. Але ў нас таксама пераследуюць, і не толькі палітычных апанентаў, ёсць сфальсіфікаваныя справы супраць праваабаронцаў і проста нязручных для ўлады людзей. Напрыклад, гучная справа Осіпавай — маладой жанчыны з вядомай апазіцыйнай палітычнай арганізацыі «Іншая Расія», якой проста падкінулі наркотыкі. Гэта адкрыта сфальсіфікаваная справа. Мы лічым палітвязнямі тых, каго па такіх справах саджаюць, і спрабуем аказваць прававую дапамогу. Але ёсць не толькі такія справы. Разумееце, у нас, у Расіі (зрэшты, як і ў вас, у Беларусі), людзей саджаюць на фармальна законных падставах, справа бывае нават не сфальсіфікаваная, і ёсць закон — нібыта прававы нарматыўны акт.

Права і закон часам бываюць вельмі рознымі рэчамі ў такіх краінах, як цяперашняя Беларусь або цяперашняя Расія. Да прыкладу, у нас ёсць так званае антыэкстрэмісцкае заканадаўства, якое ўключае вялікую колькасць нарматыўных актаў, у тым ліку і некаторыя артыкулы з Крымінальнага кодэкса, і адмысловы закон пра супрацьдзеянне экстрэмізму, але там такія «гумовыя» фармулёўкі, што іх можна нацягнуць на каго заўгодна. І калі прымаліся гэтыя законы, частка нашай ліберальнай публікі іх горача вітала. Так, вядома, з неанацыстамі гэты закон таксама дапамагае змагацца, але «гумовыя» фармулёўкі дазваляюць скіроўваць закон супраць палітычнай апазіцыі, непажаданых моладзевых груповак. Гэты закон выкарыстоўваецца супраць нацыстаў і супраць антынацыстаў, у адпаведнасці з ім і хлопцаў з «Антыфа» саджаюць.

***— Наколькі моцная палітычная матывацыя ў вашай крымінальнай справе?***

— Відавочна, што крымінальная справа, якая была распачатая па абвінавачванні мяне ў паклёпе на Рамзана Кадырава, носіць палітычны характар. Таму што ў любой прававой дзяржаве з такой нагоды крымінальная справа не ўзбуджалася б. А калі б і была распачатая, то не была б даведзена да суда — цалкам відавочна, што яна павінна была развaліцца на стадыі папярэдняга следства. Аднак не — яны давялі справу да суда, і дзяржава падтрымлівала абвінавачанне супраць мяне. Хоць у судзе справа ўсё ж развалілася — мяне апраўдалі. Але якія матывы былі ў суддзі для вынясення гэтага рашэння? Было вынесена, як ні парадаксальна, прававое рашэнне з апраўданнем мяне, але — таксама па палітычных матывах. Большасць маіх калегаў сыходзіцца ў тым, што ўлада ў дадзеным выпадку прыняла рашэнне выкарыстаць гэты працэс, каб паказаць Рамзану Кадыраву, што ён не паўсюль гаспадар. Што ён з'яўляецца гаспадаром, там, у сябе, у Чачні, а ў Маскве ён можа рабіць не ўсё. Так ці не — я не ведаю. Але, вядома, апраўданне цалкам выбіваліся з агульнага шэрагу падобных працэсаў. Але працэс не завершаны: апраўдаў суд першай інстанцыі, а цяпер суд другой інстанцыі разглядае апеляцыю Рамзана Кадырава.

***— Ці можаце вы параўнаць у цэлым умовы працы расійскіх і беларускіх праваабаронцаў на сённяшні дзень?***

— У Беларусі яны нават несувымерна горшыя. Мы ў Расіі ўсё ж можам існаваць, нягледзячы на ціск і тыя складанасці, якія мы маем. Тут жа арганізацыі пастаўлены ва ўмовы, створаныя для таго, каб яны не маглі працаваць. Дзякаваць Богу, у Расіі гэта не так, мы працуем легальна, як юрыдычныя асобы.

Хоць тут ёсць адно «але»: Расія — краіна вельмі вялікая. І сітуацыя ў розных рэгіёнах розная. Я казаў у цэлым. Але калі ўзяць некаторыя рэспублікі на Паўночным Каўказе, як Чачня, то там усё значна больш жорстка. У той жа Чачні фармальна праваабарончыя арганізацыі могуць існаваць. Але там кожны праваабаронца разумее, што да яго ўначы могуць завітаць узброеныя людзі, пасля чаго з ім, а ніхто жудасней — з яго сваякамі, нешта здарыцца. Таму трэба прама сказаць: у Чачні праваабарончыя арганізацыі дэ-факта сваю працу спынілі. Іншая справа, што ў гэтых умовах «Мемарыял» як арганізацыя дастаткова моцная, якая працуе па ўсёй Расіі, неяк забяспечвае магчымасць для працягу працы там свайго аддзялення. Мы спынялі сваю дзейнасць у Чачні пасля забойства нашай сяброўкі і калегі Наталлі Эстэміравай. Аднак нашы калегі і сябры адтуль сказалі, што мы павінны аднавіць там працу.

Чачэнскія праваабаронцы могуць патрабаваць расследавання, збіраць звесткі, пісаць пра злачынствы мінулых гадоў, калі там ішла вайна і злачынствы здзяйснялі вайскоўцы федэральных сілаў ці прысланыя з іншых рэгіёнаў міліцыянеры. А казаць што-небудзь пра тое, што робіцца зараз у кадыраўскай Чачні, яны не могуць і гэтым зусім не займаюцца. І калі «Мемарыял» узнаўляў там сваю працу, для нас вельмі важнай была салідарнасць многіх расійскіх праваабаронцаў з іншых рэгіёнаў, не паўночна-каўказскіх. Многія арганізацыі пачалі вахтавым метадам накіроўваць у Чачню так званыя зводныя мабільныя групы. Гэта форма працы расійскіх праваабаронцаў у тых рэгіёнах, дзе працаваць складана. З другой паловы 2009 года такія групы працуюць поруч з «Мемарыялам», і тое, што мы там не адны, вельмі дапамагае.

***— Што сёння неабходна і расійскаму, і беларускаму грамадству, каб такая з'ява, як палітычныя зняволеныя, сышла з нашых рэалій?***

— Зразумела, што грамадству трэба змяніцца — і расійскаму, і беларускаму. І трэба змяніць палітычныя рэжымы, якія існуюць у нашых краінах. Але мы не зменім гэтыя рэжымы, калі не зменіцца грамадства. Значная частка грамадзян і ў Расіі і, мне падаецца, у Беларусі, на вялікі жаль, спіць. Яны могуць быць незадаволены, яны могуць на кухні лаяць свае ўлады, яны могуць бясконца казаць пра сваю незадаволенасць — але яны не гатовы праявіць хоць мінімальную грамадзянскую актыўнасць. Гэта значыць, зразумець, што ад мяне гэта залежыць, а не ад нейкіх дзядзькі з цёткі, не ад начальства, не ад Захаду. І гэта, дарэчы, бяда нас, праваабаронцаў. Глядзіце, што адбываецца: да нас ідуць людзі, мы імкнёмся ім увесь час дапамагаць, мы ім дапамагаем. Атрымліваецца (і гэта наша віна), што зноў выбудоўваюцца адносіны кліента і таго, хто аказвае паслугі. Мы чалавека абараняем, ён кажа «вялікі дзякуй» нам, праваабаронцам, і зноў упадае ў спячку. Ён спаў, пакуль з ім не здарылася нешта страшнае, затым, не маючы сіл, прыйшоў да нас і (калі, дай Божа, у нас атрымалася выканаць сваю функцыю) зноў залёг у спячку. Мы, праваабаронцы, не ўмеем усё ж дастаткова канвертаваць наш уплыў, дапамогу, якую мы аказваем, у тое, каб змяніць грамадства, зрабіць яго больш актыўным.

Мне падаецца, каб не было палітрэпрэсіяў, грамадства павінна прачнуцца і ўсвядоміць, што ад яго залежыць будучыня краіны.

КАПІТАЛ

# ЛЁС БІЗНЭСУ НЯВЫЗНАЧАНЫ

Вольга ХВОІН

**Кіраўнікі прадпрыемстваў з удзелам польскага капіталу чакаюць, якія змены будуць у эканоміцы краіны бліжэйшым часам. І ўжо кіруючыся новымі ўмовамі будуць вызначаць лёс сваіх прадпрыемстваў.**




Паводле інфармацыі Пасольства Польшчы ў Беларусі, найбольш беларускіх прадпрыемстваў з польскімі інвестыцыямі знаходзіцца ў Брэсце. Другое месца па колькасці сумесных прадпрыемстваў займае Мінск, трэцяе — Гродна. На пачатак бягучага года было зарэгістравана 580 кампаній з удзелам польскага капіталу. У асноўным інвестыцыі накіроўваюцца ў гандаль, транспарт і сувязь, сельскую гаспадарку. Таксама польскія інвестары сталі ўкладваць капітал у фармацэўтыку, вытворчасць адзення.

«Што датычыцца аб'ёмаў сумеснага тавараабароту Беларусі і Польшчы, то, паводле ацэнак спецыялістаў, яго мяжа — 6 мільярдаў долараў. І да такой лічбы мы мусім імкнуцца ў нашым узаемным гандлі», — заявіў у час трэцяга эканамічнага форуму беларускіх прадпрыемстваў з польскімі інвестыцыямі «Прадпрымальніцкая дзейнасць у РБ ва ўмовах фінансавай нестабільнасці» першы дарадца пасольства Польшчы ў Беларусі Весла́ў Пакладэк.

Па дадзеных афіцыйнай беларускай статыстыкі, тавараабарот паміж гэтымі дзвюма краінамі расце: у 2009 годзе сумесны тавараабарот склаў 1,6 мільярда долараў, у 2010 годзе — 1,9 мільярда долараў. За 9 месяцаў гэтага года, па дадзеных Міністэрства эканомікі Польшчы, тавараабарот склаў 2,2 мільярда долараў. Рост тавараабароту паміж краінамі пацвердзіў і кіраўнік палітыка-эканамічнага аддзела, намеснік амбасадара Польшчы ў Беларусі Вітольд Юраш. Аднак ён дадаў, што польскія бізнэсоўцы «адчуваюць палітычную напружанасць у Беларусі і з асцярогай глядзяць на ўкладанні ў краіну».

Спадар Пакладэк мяркуе, што ёсць магчымасць дарасці і да максімальнай лічбы. У Польшчу з Беларусі вывозяць найперш нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні, неапрацаваныя лесаматэрыялы. Сюды імпартуецца свініна, садавіна, гародніна, металаканструкцыі з чорных металаў.

Па капіталаўкладаннях у беларускую эканоміку Польшча займае 10–12-е месца. У 2010 годзе польскія кампаніі інвеставалі ў Беларусь каля 27 мільёнаў долараў, за 9 месяцаў бягучага года — каля 13,4 мільёна долараў. Разам з тым шэраг кампаній, па словах Веслава Пакладэка, на час прыпынілі сваю інвестыцыйную дзейнасць у сувязі з крызісам у Беларусі і цяпер чакаюць паляпшэння эканамічных умоў для вядзення бізнэсу.

Першы дарадца пасольства Польшчы ў Беларусі Весла́ў Пакладэк гаворыць, што будучыня эканамічных адносінаў паміж Польшчай і Беларуссю будзе залежаць ад стабільнасці эканамічнай сістэмы тут. У адваротным выпадку бізнэсоўцы скіруюць сваю ўвагу на Расію.

«Уступленне Беларусі ў Адзіную эканамічную прастору, канешне, мае значэнне для міждзяржаўных адносінаў. Але перспектывы паўстануць толькі ў выпадку, калі эканоміка Беларусі будзе стабільнай, цяпер многія глядзяць сюды, каб уладкавацца. Лібералізацыя, прыватызацыя, калі гэтыя працэсы будуць, то ёсць шанцы на прыток капіталу. Як гэтага не будзе, то, самі ведаеце, абяруць Расію. Там ёсць лепшыя шанцы на стабільнасць у эканоміцы, ёсць просты выбар — або-або, — гаворыць Весла́ў Пакладэк. — У дзелавых адносінах, дзякуй Богу, вялікіх праблем няма. Праўда, тут ёсць праяўленні, што з'яўляюцца вынікам праблем у эканоміцы. Напрыклад, неплацяжы. Гэтая праблема пастаянна паглыбляецца, ёсць вялікія неплацяжы польскім прадпрыемствам. Пра іншых я проста не ведаю».

Аб глабальнай пагрозе нарастання крэдыторскай запазычанасці беларускіх прадпрыемстваў гаворыць і эканаміст Леанід Злотнікаў. «Сёлета нашы прадпрыемствы нарасцілі сваю запазычанасць на 1 мільярд долараў за паўгода. Яны свой крызіс папросту адкладвалі. Гэты працэс будзе няцяжка працягваць і далей. Але пасля таго, як панізіўся міжнародны крэдытны рэйтынг Беларусі, некаторыя пасольствы рэкамендуюць сваім фірмам працаваць па перадаплаце, — гаворыць эксперт. — Міжнародны валютны фонд паказаў, што ў Беларусі няма рэсурсаў пакрываць пазыкі. Мы жылі ў доўг і, здавалася б, цяпер перайшлі да жыцця па сродках, хаця раней беларусы спажывалі ў сярэднім на 15% больш, чым выраблялі. Цяпер мусім разлічыцца за старыя пазыкі. Мяне часта пытаюць, калі будзе дэфолт. І я кажу, што дэфолт будзе тады, калі дзяржава не справіцца са сваімі пазыкамі. Але ў нас цяпер найбольшая праблема з прадпрыемствамі-даўжнікамі».

Леанід Злотнікаў падкрэслівае, што ў Беларусі застаецца найбольшы спажывец валюты — інвестыцыйная дзяржпраграма. І калі будуць вернутыя затрачаныя на яе сродкі — невядома. «Краіна ў няўстойлівым стане, прагнозы рабіць складана, — гаворыць эканаміст. — Але, калі не будзе глабальных зменаў у лібералізацыі дзяржаўнага курсу, то можна чакаць, што будзе працягвацца стагнацыя. І нават калі і будзе стабілізацыя за кошт знешніх крыніц, то ненадоўга».

Пасольства Польшчы перад гэтым эканамічным форумам рабіла апытанне кіраўнікоў прадпрыемстваў з польскім капіталам, што працуюць у Беларусі. Рэспандэнты сярод найбольш трывожных фактараў для сваёй працы назвалі непрагназуемы курс рубля, недахоп валюты, высокія працэнтныя стаўкі па крэдытах, нестабільнасць заканадаўства, празмернае рэгуляванне ў эканоміцы, рознае стаўленне мясцовых уладаў да фірмаў з замежным капіталам, карупцыю. Бізнэсоўцы адзначылі, што найперш хацелі б бачыць паніжэнне падатковай нагрузкі, рэфармаванне эканомікі і лібералізацыю.

Юрыст камерцыйнай практыкі кампаніі Revera Conslting Group Дзмітрый Зікрацкі падкрэслівае, што ацэньваць эфектыўнасць геапалітычнага ўтварэння Адзіная эканамічная прастора і яго рэальны ўплыў на стасункі Беларусі з іншымі дзяржавамі пакуль зарана, бо ў доступе няма шэрагу датычных дакументаў, няма і праваапрымяняльнай практыкі.

«Гаварыць аб развіцці адзінай эканамічнай прасторы можна толькі ў выпадку наяўнасці добрай палітычнай волі бакоў. Калі гэтая эканамічная інтэграцыя, як яна ідзе цяпер, — Мытны саюз з ліпеня 2010 года, Адзіная эканамічная прастора з 2012 года, кадыфікацыя ўсіх пагадненняў з 2015 года, як гэта прадугледжана ў апошнім пагадненні Еўразійскай эканамічнай камісіі, — калі гэта ўсё будзе рухацца, то Адзіная эканамічная прастора будзе працаваць. Калі палітычнай волі не будзе, то АЭП у тым выглядзе, як гэта запраграмавана, працаваць не будзе», — падкрэслівае Дзмітрый Зікрацкі.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# САТЫРА ПА-БАРАНАВІЦКУ



**Мусіць, па сумарнай колькасці палітвязняў на тысячу насельніцтва Беларусь даўно стала лідарам сярод усіх краін, якія два дзесяцігоддзі таму пачалі рух па шляху да рынкавай эканомікі ды палітычнай дэмакратыі. І амаль кожны дзень дадае да спісу чарговую ахвяру.**

Адзначым, што ў адрозненні ад многіх эканамічных паказчыкаў, гэты лёгка паддаецца як колькаснаму вымярэнню, так і якаснай інтэрпрэтацыі. Прыкладам, людзей арыштоўваюць за дзеянні, якіх яны яшчэ не ажыццяўлялі. У мэтах прафілактыкі. А калі хапаюць на вуліцы, то быццам за дробнае хуліганства, то па падазрэнні ў збыце наркотыкаў, як гэта было нядаўна з адным паважаным прафесарам сацыялогіі. У савецкія часы на гэты конт сумна жартавалі — пайшоў за цыгарэтамі, а трапіў на Лубянку.

І нават калі перасталі хапаць людзей на вуліцы без прычыны, савецкае грамадства па ўсіх навуковых дэфініцыях вызначалася як таталітарнае. Чаму ж адносна беларускага палітолагі ўсё яшчэ шукаюць адпаведныя дэфініцыі? Ці ж няма ў нас партыі ўлады, ці няма «правадыра», якому з усёй не такой ужо і малой сілы дзяржаўнай прапагандысцкай машын лепіцца самы натуральны культ асобы? Адзінае, што бракуе поспеху, гэта якасць асобы. Але ж для навукі большае значэнне мае сацыяльна-палітычны статус і роля, якую гэта персона спрабуе выканаць.

Па такіх жа правілах без правіл ажыццяўляецца кантроль за ўсімі астатнімі сферамі дзейнасці, асобамі і сацыяльнымі групамі. Прыкладам, у месцах зняволення, мусіць, другой па колькасці (акрамя чыстых крымінальнікаў) групай з'яўляюцца бізнэсоўцы. Мноства з іх прадстаўлена звычайнымі ахвярамі абставін, якія могуць быць створаны для бізнэсу толькі таталітарным рэжымам. З улікам гэтага трэба лічыць, што Савецкі Саюз на асобных этапах выглядаў (ці быў) нашмат больш ліберальным да бізнэсу, чым наша дзяржава з сацыяльна-арыентаванай эканомікай. Лёгкасць, з якой Астап Бэндэр з «Залатога цяляці» Ільфа і Пятрова рэгіструе кантору-аднадзёнку «Рогі і капыты» не можа не здзіўляць. Праўда, гэты сатырычны раман напісаны ў 1931 годзе, на самым пачатку Вялікага пералому, у ходзе якога праз усталяванне калгасаў было адноўлена прыгонніцтва для бальшыні насельніцтва краіны. І хто ведае, каб не гэты «пералом», можа б і не спатрэбілася перабудова, якой не вынесла знясіленая шматгадовым эксперыментам ды татальным кантролем эканоміка.

Дарэчы, у Беларусі калгаснае аднаўленне пачалося з першага дня прэзідэнцтва Лукашэнкі. І гэта дазваляе правесці паралель паміж «тым» і «нашым» часам і вызначыцца з нашымі перспектывамі. Гісторыя ж любіць паўтарацца…

Гэта бачна ўжо і па тым, што ў сучаснай Беларусі немагчымы тыя спосабы, з дапамогай якіх Астап Бэндэр распачаў пераследаванне ўцёклага ад справядлівай экспрапрыяцыі падпольнага мільянера Карэйкі. Проста пагнаў «Антылопу Гну» Адама Казлевіча паперадзе афіцыйнага аўтапрабегу, ад імені якога атрымліваў цёплы прыём, харчовыя рэсурсы ды праводзіў прапаганду сярод сустракаючых мясцовых жыхароў. А мясцовыя ўлады былі настолькі далікатнымі, што так і не адважыліся пацікавіцца паперамі вялікага камбінатара. У сучаснай Беларусі ён бы і кіламетра не праехаў. Прыпынілі б па падазрэнні, што гэты «Ролэн-Дзітрых» знаходзіцца ў вышуку.

Зрэшты, нашы ўжо даўно пайшлі далей за тых, тады яшчэ не зусім дасведчаных ды нахабных савецкіх начальнікаў. Прыкладам, тыя прафсаюзы гарантавалі сваім чальцам права піць піва, а сучасныя беларускія з глыбокім задавальненнем ухвалілі ініцыятыву Лукашэнкі па замене бестэрміновага найму на кантрактную сістэму. Як кажуць, адчуйце розніцу!

Даволі дасканала, на наш погляд, меру сацыяльнага дэбілізму (у сэнсе адсутнасці пачуцця гумару) чальцоў ды інстытутаў так званай уладнай вертыкалі жыхар Баранавіч вызначыў з дапамогай эксперыментаў. Спачатку ён папрасіў раённыя ўлады перадаць у арэнду мясцовым бізнэсоўцам памяшканне закінутай фермы. Але нават не дачакаўся адказу на сваю просьбу. Пасля падаў заяўкі на правядзенне велапрабегу ды марафонскага забегу супраць бюракратызму. Усе гэта цалкам кладзецца ў стыль і схему паводзін Астапа Бэндэра. На гэты раз выканкам адказаў адмовай і фактычна стварыў сатырычную пародыю на самога сябе. У стылі Ільфа і Пятрова. Але нават на гэтым фоне ўнікальнай выглядае справакаваная рэакцыя чыноўніцтва на просьбу спадара Хітрыка даць яму хоць бы магчымасць глыбока і вольна падыхаць на плошчы побач з помнікам Леніну.

Аказваецца не, ні побач з Леніным, ні побач з выканкамам у Беларусі вольна дыхаць нікому не дазволена. Акрамя самога Леніна ды чальцоў выканкама. Калі ім дазволяць вышэйшыя... У выніку атрымаўся цудоўны хэпенінг без актыўнага дзеяння — баранавіцкія ўлады здолелі стварыць сатырычную пародыю на афіцыйную і недатыкальную тэму, пра краіну, дзе дзякуючы ўладзе так вольна дыхае чалавек.

Гэта ўжо, як кажуць, апошні штрых, пасля якога карціна дасягае эстэтычнай дасканаласці з гледзішча намераў мастака. Ні дадаць, ні адняць.

▸ СПАДЧЫНА

# АСТАПОВІЧУ АД ЛЕАНАРДА

**«Эскізны праект рэканструкцыі, рэстаўрацыі і аднаўлення правага боку вуліцы Гандлёвай у горадзе Мінску», распрацаваны ў межах агульнанацыянальнай кампаніі «Будзьма беларусамі» сябрамі архітэктурнай секцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антонам Астаповічам, Антонам Вантухам, Андрэем Лары і Уладзімірам Папругай пры ўдзеле Івана Вантуха, Арцёма Караткова і Паўла Растоўцава, стаў пераможцам IV Мінскай міжнароднай біенале маладых архітэктараў «Леанарда–2011» у намінацыі «Рэстаўрацыя, рэгенерацыя, рэканструкцыя і аднаўленне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны». Што гэта за праект? Пра гэта Антон Астаповіч распавядае журналісту «НЧ» Марату Гаравому.**

— Пад аховай дзяржавы ў гістарычным цэнтры Мінска знаходзяцца аўтэнтычная аб'ёмна-планіровачная структура, будынкі і збудаванні, ландшафт і культурны пласт. Іх захаванне на тэрыторыі правага (цотнага) боку вуліцы Гандлёвай (былой Зыбіцкай) і паўднёва-ўсходняй часткі Замчышча з'яўляецца апошняй магчымасцю не страціць «Гістарычны цэнтр Мінска» як матэрыяльную нерухомую каштоўнасць міжнароднага значэння. Вось чаму архітэктурная секцыя таварыства некалькі гадоў працуе над праектамі навукова абгрунтаванага аднаўлення былых фрагментаў помніка дойлідства.

Наш грамадскі праект рэгенерацыі правага боку вуліцы Гандлёвай уяўляе сабой эскізную прапанову па ўзнаўленні двух кварталаў тыповай гарадской жылой і грамадзянскай малапавярховай мураванай забудовы другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзяў. Падрыхтоўка гэтага альтэрнатыўнага праекта матывавалася тым, што паводле замовы КУП «Мінская спадчына» спецыялісты КУП «Мінскпраект» распрацавалі свой варыянт аднаўлення забудовы цотнага боку Гандлёвай, да якога ў грамадскасці шмат прэтэнзій з пункту гледжання патрабаванняў айчынных нарматыўна-прававых актаў і міжнародных метадычных дакументаў у галіне аховы спадчыны і правядзення прац на яе аб'ектах.

Справа ў тым, што прапанова «Мінскпраекта» зыходзіць з новай трасы інжынерных камунікацый, пракладзеных у 2008 годзе, і парушае чырвоныя лініі аўтэнтычнай забудовы вуліцы. Такім чынам, гэтая прапанова прыводзіць да фальсіфікацыі гістарычнай планіровачнай структуры, без аднаўлення якой далейшыя працы ў навукова-абгрунтаваным і прававым рэчышчы проста немагчымыя. Тры гады таму, насуперак Дэтальнаму плану рэканструкцыі, рэстаўрацыі, аднаўлення і добраўпарадкавання «Гістарычнага цэнтра Мінска», быў пракладзены калектар уздоўж праезнай часткі правага боку Гандлёвай. З-за гэтага калектара шырыня вуліцы пры яе адбудове пашырыцца амаль на сем метраў. Нягледзячы на тое, што калектар прайшоў па месцах падмуркаў гістарычнай забудовы, дзеля захавання яе габарыту спецыялісты прапануюць выйсце — узяць калектар у тэхнічны кораб і праз яго забяспечыць прахады да інжынернай камунікацыі. А зверху кораба, на бетонных плітах, можна ставіць будынкі, тым больш такія лёгкія двухпавярховыя галерэйнага тыпу, якімі была забудавана вуліца.

Для аднаўлення страчанай аўтэнтычнай аб'ёмна-планіровачнай структуры Гандлёвай і асобных яе будынкаў можна пайсці і на перакладку калектара пад праезную частку вуліцы. Прычым кошт такой перакладкі не перавысіць 6% агульнага сметнага кошту ўсяго праекта.

Нашы прапановы строга грунтуюцца на навуковых даследаваннях, праведзеных архітэктарам Вадзімам Гліннікам, а таксама спецыялістамі таварыства ў шэрагу архіваў, у тым ліку ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі, Беларускім дзяржаўным архіве кіна-, фона- і фотадакументаў, у асабістым архіве актывіста грамадскага аб'яднання, даследчыка і калекцыянера Паўла Растоўцава. З пяці былых кварталаў правага боку вуліцы Гандлёвай у сённяшняй горадабудаўнічай сітуацыі ёсць магчымасць дакладна аднавіць два кварталы з забудовай і паміж імі трэці — рэкрэацыйны квартал, дзе калісьці на балоце знаходзіўся Малочны рынак.

Аднак Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры не ўхваліла наш праект, нягледзячы на тое, што ён атрымаў высокую ацэнку кіраўніцтва камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, а таксама вучонага савета архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Наадварот, рада падтрымала прапанову «Мінскпраекта» і толькі прапанавала яго спецыялістам улічыць у сваім праекце «пэўныя» рэкамендацыі Таварыства аховы помнікаў.

На жаль, нашы прапановы ігнаруюцца, а рэалізацыя прапаноў «Мінскпраекта» можа прывесці да знішчэння і страты (без адпаведных навуковых фіксацый і належнага вывучэння) элементаў былой высокашчыльнай гарадской забудовы.

Перамога нашага праекта на «Леанарда» не толькі натхняе, але і дадае аргументаў у праваце грамадскасці. Мы выходзім з таго, што працэс рэстаўрацыі — высокаспецыялізаваная аперацыя. Накіраваная на захаванне і раскрыццё эстэтычнай і гістарычнай вартасці помніка, рэстаўрацыя грунтуецца на павазе да аўтэнтычных матэрыялу і дакументаў. Рэстаўрацыю неабходна спыніць у той кропцы, дзе пачынаецца здагадка. Іншы падыход вядзе толькі да фальсіфікацыі гісторыка-культурнай каштоўнасці, што катэгарычна недапушчальна з прававога і маральнага пунктаў гледжання.

Падчас працы над праектам па вуліцы Гандлёвай мы імкнуліся аднавіць накірункі-звязкі «Гістарычнага цэнтра Мінска» з перыферыйнымі тэрыторыямі-прадмесцямі, у тым ліку з Замчышчам. І па ініцыятыве «Мінскай спадчыны» мы ўнеслі карэкціроўкі ў прапановы «Мінскпраекта» па аднаўленні і музеефікацыі паўднёва-ўсходняй часткі Замчышча.

Згодна з прапановамі «Мінскпраекта», на плошчы прыблізна ў 5 гектараў плануецца ўзвесці комплекс, які ўключае падземную залу-амфітэатр на 240 месцаў з абходнымі галерэямі і археалагічнай экспазіцыяй. У натуральную велічыню мяркуецца пабудаваць макет фрагмента старажытнага горада XII стагоддзя з брамай, абарончымі валамі, храмамі, вуліцамі і дамамі. На Ніжнім рынку запланаваныя гандлёвыя рады, адкрытыя крамы з завесамі і гандлёвы павільён пад тэнтам, а таксама тэатр-балаган для выступленняў артыстаў.

Абапіраючыся на гістарычныя, у тым ліку археалагічныя, даследаванні, Таварыства аховы помнікаў выступае за змяненне трасы валоў замчышча і яго планіроўкі, за аднаўленне аб'ёмна-планіровачнай структуры Ніжняга і Мяснога рынкаў на сярэдзіну XIX — пачатак XX стагоддзя са страчанай высокашчыльнай мураванай забудовай. Мы таксама змагаемся за аднаўленне першага Мінскага праваслаўнага храма менавіта над яго аўтэнтычнымі падмуркамі, якія захаваліся. Гаворка ідзе аб гіпатэтычным узнаўленні вобліку чатырохслупавага трохапсіднага амаль квадратнага ў плане храма ў візантыйскім стылі XII стагоддзя для рэканструкцыі аўтэнтычнай планіроўкі замчышча. Акрамя таго, мы выступаем за аднаўленне на замкавым валу аднаго з самых старажытных мураваных будынкаў Мінска — Гродскага суда XVIII стагоддзя».

Зараз мы дабіваемся грамадскага абмеркавання праектаў па Гандлёвай і Замчышчы, падрыхтаваных «Мінскпраектам» і таварыствам аховы помнікаў. Рэалізацыя па агульнапрынятай міжнароднай методыцы нашых навукова абгрунтаваных праектаў прывядзе да з'яўлення ў «Гістарычным цэнтры Мінска» той архітэктурнай разынкі, якой так не хапае гэтаму помніку дойлідства».





Вуліца Гандлёвая ў 1950-я гады і фрагменты праекту грамадскасці



Вуліца Гандлёвая ў 1950-я гады



Фрагменты праекту грамадскасці

## Даведка

Мінская міжнародная біенале маладых архітэктараў «Леанарда» праводзіцца з 2005 года Саюзам архітэктараў Беларусі пры падтрымцы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Міністэрства культуры, Мінскага гарвыканкама, Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД, Міжнароднага саюза архітэктараў і Міжнароднай асацыяцыі саюзаў архітэктараў. Выстава заснавана дзеля выяўлення лепшых архітэктурных прац і аўтараў, вызначэння перспектыўных накірункаў развіцця архітэктуры, папулярызацыі творчых дасягненняў маладых архітэктараў.

У межах выставы адбываецца конкурс у сямі намінацыях: «Горадабудаўніцтва і планіроўка», «Грамадскія і прамысловыя комплексы, будынкі і збудаванні», «Жылыя шматпавярховыя дамы», «Жылыя аднакватэрныя і малапавярховыя дамы», «Ландшафтная архітэктура, вулічны дызайн, манументальнае мастацтва і скульптура ў архітэктуры», «Рэстаўрацыя, рэгенерацыя, рэканструкцыя і аднаўленне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны», а таксама «Інтэр'еры будынкаў і збудаванняў».

## Даведка

Антон Астаповіч нарадзіўся 23 кастрычніка 1964 года ў горадзе Асіповічы. Скончыў сярэднюю школу, Мінскае медыцынскае вучылішча №2, гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў фельчарам хуткай медыцынскай дапамогі ў Мінску, чыгуначнай бальніцы ў Асіповічах. З 1990 па 2006 гады — у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту на пасадах малодшага навуковага супрацоўніка, загадчыка сектара, загадчыка аддзела і намесніка дырэктара па навуцы. З 2007 года ўзначальвае «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры». З 2009 года з'яўляецца сакратаром Грамадскай назіральнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, а з 2010 года — сябрам Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце міністраў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 5 снежня, панядзелак

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.45** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Камедыйная меладрама «Проста неверагодная» (ЗША).
**13.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**16.00** Да цешчы на бліны.
**16.35** Тэлефільм АТН «Круглае» цыклу «Зямля беларуская».
**16.50** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 01.05** «Зона Х».
**19.30** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45, 01.15** Дзень спорту.
**22.00** Камандзіроўка.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Клуб рэдактараў.
**00.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Справа была ў Пянькове».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Яўген Міронаў. «Прозвішча абавязвае».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Прэм'ера. «Лёс на выбар».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Зімовая спякота». Расія-Францыя-Іспанія-Бельгія , 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Ясі і худзей.
**09.40** Навіны надвор'я.
**10.10** Жансавет.
**10.50** Кінаспробы.
**11.20** Бітва экстрасэнсаў.
**12.30** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.35** Серыял «Гарачы лёд». 1-я серыя.
**14.35** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**17.55** Серыял «Гарачы лёд». 1-я серыя.
**18.55** Фантастычная камедыя «Споведзь нябачніка» (Францыя-ЗША).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Авертайм.
**00.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**13.00** «Мой срэбны шар».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.35** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кулінарны паядынак».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Руськія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя». Ток-шоў.

### Eurosport

**10.30, 15.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу (Швецыя).
**11.00** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Жанчыны. Германія - Шатландыя. Масква (Расія).
**14.00, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**15.30** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Дзень 3-і.
**18.30, 02.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Дзень 3-і.
**19.30** Футбол. Часопіс.
**20.30** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Жанчыны. Германія - Швецыя. Масква (Расія).
**22.45** Вось дык так!!!
**23.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.30** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**01.00** Футбол. Часопіс.

### Белсат

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды».
**08.10, 14.05** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 4 серыя.
**08.55, 14.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.10, 18.05** Дакументальная гадзіна: «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча: ч. 1.
**09.55, 15.10** ПраСвет.
**10.20, 15.45** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 4 серыя.
**11.10, 16.30** Эксперт.
**11.35** «Краты», дак. цыкл.
**11.45** «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**13.35** Зона «Свабоды».
**15.30** «Краты», дак. цыкл.
**17.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 8 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.50** «Як пушчу стралу», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Вагон.
**20.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Маскоўская жонка», дак. фільм, 2005 г., Расія–Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл.
**21.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.55** «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**23.45** Аб'ектыў.
**00.10** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 6 снежня, аўторак

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.40** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Арэна.
**12.35** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**12.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камандзіроўка.
**15.40** Скрынка перадач.
**16.10** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.15** Цыкл тэлеперадач «Дыялогі аб цывілізацыі».
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Дзень спорту.
**22.00** «Барселона: Больш, чым каманда». Тэлефільм АТН.
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Барселона - БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Мікалай Караччанцаў. Каханню не названы кошт».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** «Высоцкі. «Вось і спраўджваецца ўсё, што прараканецца…».
**00.30** «След».
**01.15** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Зімовая спякота». Расія-Францыя-Іспанія-Бельгія , 2004 г.
**10.40** «Справа асобай важнасці».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Хлоя». ЗША-Канада-Францыя, 2009 г.
**15.35** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Зваротны след». ЗША, 1990 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**23.30** «Аўтапанарама».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял. Заключная серыя.

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**09.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**10.50** Авертайм.
**11.25** Школа рамонту.
**12.30** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.35** Серыял «Гарачы лёд». 2-я серыя.
**14.35** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Нянудны глобус.
**15.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.10** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**17.55** Серыял «Гарачы лёд». 2-я серыя.
**18.55** Баскетбол. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.55** Спорт-кадр.
**00.25** Рэальны свет.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.45** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.45** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.05** «Сёння. Вынікі».
**23.30** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Порту (Партугалія) - Зеніт (Расія).

### Eurosport

**10.30** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Шатландыя - Данія. Масква (Расія).
**13.00** Футбол. Часопіс.
**14.00** Вось дык так!!!
**15.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Дзень 3-і.
**15.30** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Дзень 4-ы.
**18.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**20.00** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**20.30** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Масква (Расія).
**22.00** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Вось дык так!!!
**02.15** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**02.45** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**03.15** Вось дык так!!!

### Белсат

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Чалавек прэзідэнта–2», палітычны баявік, 2002 г., ЗША.
**09.00** «Краты», дак. цыкл.
**09.15** «Таямніца Сагалі», серыял: 8 серыя.
**09.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Маскоўская жонка», дак. фільм, 2005 г., Расія–Польшча.
**10.50** МакраФон.
**11.50** «Ранча», серыял: 10 серыя.
**12.40** «Таямніца Сагалі», серыял: 8 серыя.
**13.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Маскоўская жонка», дак. фільм, 2005 г., Расія–Польшча.
**13.55** МакраФон.
**14.50** «Краты», дак. цыкл.
**15.05** «Чалавек прэзідэнта–2», палітычны баявік, 2002 г., ЗША.
**16.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 11 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 19 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавўчая праграма).
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл.
**21.35** Сальда (эканамічная праграма).
**21.55** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**22.35** Рэпартэр.
**23.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

## 7 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Сфера інтарэсаў.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**12.50** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж «На ўдыху».
**15.40** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма аб турызме.
**16.10** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.50** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202».
**21.00** Панарама.
**21.40** «20 гадоў без Саюза». Тэлефільм.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Базель - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**00.40** Дзень спорту.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Асяроддзе пасялення.
**00.30** «След».
**01.15** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінdriчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Зваротны след». ЗША, 1990 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Узмах крылаў матылька». Францыя, 2000 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**00.45** «Дурні, дарогі, грошы».

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Спорт-кадр.
**09.35** Цела чалавека.
**10.20** Містычная меладрама «Дзікае паляванне караля Стаха». 1-я і 2-я серыі.
**12.40** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.45** Серыял «Гарачы лёд». 3-я серыя.
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Нянудны глобус.
**15.30** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.10** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**17.55** Меладраматычны серыял серыял «Гарачы лёд» (Расія- Украіна). 3-я серыя.
**18.55** Хакей. КХЛ.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Спортлато 5 з 36.
**21.30** КЕНО.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.40** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.25** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**00.00** Рэальны свет.

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.40** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.40** Навіны - Беларусь.

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.15** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.10** «Сёння. Вынікі».
**23.35** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Інтэр (Італія) - ЦСКА (Расія).

**10.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**10.45, 20.00** Вось дык так!!!
**11.00** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Латвія - Германія. Масква (Расія).
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**14.10** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**15.30** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**18.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**19.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**20.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**21.00** Абранае па серадах.
**21.10** Навіны коннага спорту.
**21.15** Гольф. Ганконг (Кітай).
**21.45** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**21.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**22.00** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**01.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны этап. Мужчыны. Германія - Швейцарыя. Масква (Расія).
**02.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 19 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**08.55** «Тры шалёныя нулі», серыял.
**09.25, 14.10** На колах.
**09.50, 14.35** Рэпартэр.
**10.20** Сальда (эканамічная праграма).
**10.35** «Краты», дак. цыкл.
**10.45** Эксперт.
**11.10** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.30** «Ранча», серыял: 11 серыя.
**12.20** «Арол», серыял: 19 серыя.
**13.15** Два на два (тэледыскусія).
**13.40** «Тры шалёныя нулі», серыял.
**15.05** Сальда (эканамічная праграма).
**15.20** «Краты», дак. цыкл.
**15.30** Эксперт.
**16.00** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**16.15** «Краты», дак. цыкл.
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.25** Невядомая Беларусь: «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**18.50** «Падарожжа па руінах», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.45** «Апантаныя», дак. цыкл, 2011 г., Беларусь: 1 серыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл.
**21.35** Без рэтушы: «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**22.05** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**23.05** Два на два (тэледыскусія).
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

## 8 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**10.10** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.00** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «20 гадоў без Саюза». Тэлефільм.
**16.20** Зона камфорту.
**16.55** Вострасюжэтны серыял «Замах».
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 00.25** Зона Х.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45, 00.35** Дзень спорту.
**22.00** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.00** «Зваротны адлік».
**00.30** «След».
**01.15** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Узмах крылаў матылька». Францыя, 2000 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Легенда». ЗША-Вялікабрытанія, 1985 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Пятроўка, 38. Каманда Сяменава». Серыял.
**00.50** «Дурні, дарогі, грошы».

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Страсці па культуры.
**09.45** Рэальны свет.
**10.25** Кожны мае права быць розным.
**10.55** Меладрама «Давай пажэнімся».
**12.30** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.35** Серыял «Гарачы лёд». 4-я серыя.
**14.35** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**17.55** Меладраматычны серыял «Гарачы лёд» (Расія- Украіна). 4-я серыя.
**18.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.40** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Час футболу.
**00.35** Рэальны свет.

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.30** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.30** Навіны - Беларусь.

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Вочная стаўка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

**10.30** Вось дык так!!!
**11.00** Live. Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Масква (Расія).
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**14.10** «Алімпійскія Гульні. Разам у Лондан. Часопіс.
**14.25** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/8 фіналу.
**15.30** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**18.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**20.00** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Кваліфікацыя.
**21.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Польшча. Дзень 1-ы.
**22.00** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**01.00** Покер. Барселона (Іспанія).
**02.00** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**02.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Кваліфікацыя.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**08.30** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**09.15** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.10** Навігатар.
**10.30** «Падарожжа па руінах», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.45** «Краты», дак. цыкл.
**11.00** Два на два (тэледыскусія).
**11.25** Без рэтушы: «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**11.55** «Апантаныя», дак. цыкл: 1 серыя.
**12.05** Невядомая Беларусь: «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**12.40** «Каралева Бона», тэлесерыял: 5 серыя.
**13.35** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**14.20** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 11 серыя.
**14.50** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.15** «Краты», дак. цыкл.
**15.25** Без рэтушы: «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**15.55** Два на два (тэледыскусія).
**16.25** Невядомая Беларусь: «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 1.
**17.00** «Зорны пірат», тэлесерыял: 2 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Апошні дыкататар Еўропы», дак. фільм, 2003 г., Польшча.
**18.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**18.40** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 4 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Краты», дак. цыкл.
**21.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.05** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Малая Міс Цыганія», дак. фільм, 2009 г., Харватыя.
**22.45** «Новенькая», дэтэктыўны серыял.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 11 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Меладрама «Душачка» (СССР).
**13.55** Мультфільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Музычная меладрама «Вулічныя танцы» (Вялікабрытанія).
**17.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Горад мары, што ажыццявілася».
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст».
**21.00** Панарама.
**21.35** Тэлефільм АТН «Дзіцячае Еўрабачанне-2011. За кадрам».
**22.05** Прэм'ера. Трылер «Здань» (Францыя -Германія-Вялікабрытанія).
**00.30** Авантурная камедыя «Дзяўчына майго лепшага сябра» (ЗША).
**02.10** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Фазэнда.
**11.45** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.45** «Высоцкі. «Вось і спраўджваецца ўсё, што прапракаецца…».
**15.00** Прэм'ера. «Віталь Саломін. Паміж Ватсанам і «Зімовай вішняй».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.25** «Эстрадны кактэйль».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Здабытак Рэспублікі».
**23.50** «Yesterday live».
**00.55** Фільм «Жанчына для ўсіх».

### СТВ

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.30** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікі сняданак».
**11.00** Фільм «КОББ». ЗША, 1994 г.
**13.15** «Добры дзень, доктар».
**13.50** Фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў». СССР, 1976 г.
**15.40** Ток-шоу «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Манашкі ў бягах». Вялікабрытанія, 1990 г.
**22.30** Прафесійны бокс.
**23.30** Фільм «Гісторыя звычайнай утрапёнасці». Францыя-Італія , 1981 г.
**01.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**06.55** Дэтэктыў «Блакітны карбункул».
**08.10** Прыступкі Веры.
**08.25** Гаспадар.
**08.55** Цела чалавека.
**09.35** Ясі і худзей.
**10.10** Школа рамонту.
**11.20** Інтуіцыя.
**12.25** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Кінаспробы.
**18.30** Жаночая ліга.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Прамая трансляцыя.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45** Біяграфічная драма «Жыццё ў ружовым колеры» (Францыя).
**00.20** Інтуіцыя.

### РОССИЯ

**07.00** «ХА». Маленькія камеды.
**07.25** «Уся Расія».
**07.40** Фільм «Секта». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Ідзі і не аглядайся».
**13.35** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.30** Прэм'ера. «Аляксандр Салжэніцын. Выратаванае інтэрв'ю».
**15.40** «Гарадок». Дайджэст.
**16.15** Фільм «Мытня».
**17.55** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера - 2011. «Стылягі-шоў».
**23.00** Паўфінал Першай лігі Міжнароднага Звяза КВЗ.

### НТВ

**07.10** Серыял «Марскія д'яблы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Крамлёўская кухня».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**22.00** «Таемны шоў-бізнэс».
**23.00** «Нтвшнікі».
**00.10** Мастацкі фільм «Маё апошняе першае каханне».

### EUROSPORT

**10.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Масква (Расія). Фінал.
**12.00** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**12.45** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**14.00** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Супер-гігант.
**15.00** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 2.
**15.45** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**17.30** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт вольным стылем. Давос (Швейцарыя).
**18.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**19.00** Лыжнае двааборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена.
**19.30** Live. Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Польшча. Дзень 4-ы.
**21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**23.00** Live. Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**02.00** Картынг. Турнір (Францыя). Дзень 2.
**03.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** На колах.
**08.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 7 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.50** «Краты», дак. цыкл.
**10.05** Беларускія лёсы: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
**10.35** Аблічча таталітарызму: «Звычайныя выбары», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**11.35** МакраФон: «Троіца», фільм-канцэрт.
**12.15** Два на два (тэледыскусія).
**12.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 8 серыя.
**13.55** Калыханка для самых маленькіх.
**14.25** «Краты», дак. цыкл.
**14.40** «Джэйн Остэн», маст. фільм, 2007 г., Вялікабрытанія.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія).
**18.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**18.35** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 5 серыя.
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Дакументальная гадзіна: «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча: ч. 2.
**20.30** «Лекар душы», рэпартаж, 2008 г., Беларусь.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт.
**22.10** Фільматэка майстроў: «Дэраў», біяграфічная драма, 1991 г., ЗША.
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).


## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01 Вольга;
Слуцк: (8044) 755 66 48 Марына.

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ________
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З новага 2012 года мы вымушаны ўзняць падпісны кошт аднаго нумара газеты да 1200 руб., аднаго месяца — 4800 руб. Для тых, хто паспее падпісацца ў гэтым годзе, кошт застанецца ранейшым (750 руб. за нумар).

Запрашаем да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл.: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ВЫКЛІК

# ЦІ ПАТРЭБНА ЭРОТЫКА АРАБСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ?

Алег НОВІКАЎ

**Публікацыя 20-гадовай актывісткай сваіх ню-здымкаў у блогу ўзарвала Егіпет і павялічыла шансы на прыход да ўлады ісламістаў.**



Магда Алія Эль-Махдзі

Дзяўчыну завуць Магда Алія Эль-Махдзі. Яна — студэнтка амерыканскага ўніверсітэта ў Каіры і вядомая як медыя-актывіст, удзельніца апошняй рэвалюцыі супраць дыктатуры Хосні Мубарака. Выкладваючы свае эратычныя здымкі ў блог на рэсурсе Blogspot, яна наўрад ці думала пра такі шквал эмоцый. Па яе словах, яна проста імкнулася прадэманстраваць свабоду думкі і хацела паспрыяць эмансіпацыі жанчын у Егіпце, каб вызваліць іх ад сэксуальных комплексаў у духу рэвалюцыі.

«Ідуць судовыя працэсы супраць мадэляў, якія пазіравалі для мастакоў і скульптараў яшчэ ў 1970-я гады. Схаваныя кніжкі пра эратычнае мастацтва, знішчаныя скульптуры аголеных людзей антычных часоў. А цяпер здымай адзенне і паглядзі на сябе ў люстэрка. Такім чынам ты можаш выратаваць сваё цела, якое ты так зневажаеш. Пазбаўся сваіх сэксуальных комплексаў назаўжды. І толькі пасля гэтага ты адчуеш, чаму патрэбна свабода выражэння поглядаў», — напісала пад здымкамі Алія.

Пасля таго, як выявы былі выкладзеныя на блог, Эль-Махдзі паслала паведамленне пра гэта на Twitter. Наступнай раніцай яна прачнулася самай славутай дзяўчынай у краіне. Так, толькі за тыдзень тую старонку ў сеціве наведалі больш за 2 мільёна карыстальнікаў. На форуме пакінулі свае каментары каля 12 тысяч чалавек. У інтэрнэце можна знайсці шмат чатаў, прысвечаных учынку Эль-Махдзі. Прычым спрачаюцца юзеры не наконт эстэтычных якасцяў і цялеснага хараства Эль-Махдзі, а пра яе акцыю ў кантэксце актуальнага палітычнага моманту.

Эротыка ад Эль-Махдзі аказалася ў фокусе палітычных дэбатаў паміж кансерватарамі і ліберaламі. Думаецца, што першыя і так не прайшлі б міма падобнага замаху на мараль. Яшчэ ніводная дзяўчына ў Егіпце не адважвалася на такі крок. Аднак паколькі ўся краіна жыве хуткімі парламенцкімі выбарамі, выявы Эль-Махдзі сталі для іх галоўнай тэмай прапаганды. Палітыкі з вядучай ісламісцкай партыі «Браты-мусульмане» сцвярджаюць, што ў выпадку перамогі ліберaлаў або левых усе егіпецкія жанчыны будуць падобныя на Эль-Махдзі. «Свабода — гэта не прастытуцыя», — галоўны лозунг крытыкаў выхадкі Аліі.

Егіпецкае грамадства нельга назваць цалкам архаічным у плане правоў жанчыны, аднак маральныя табу тут хапае. Напрыклад, публічны пацалунак лічыцца адміністратыўным парушэннем. Прыкладна палова жанчын у краіне дасюль носяць паранджу. Сям'я лічыцца сакральным інстытутам. Адным словам, агітацыя ісламістаў знайшла падтрымку ў вялікім сегменце грамадства. Акрамя таго, узгадалі, што бой-фрэнд Эль-Махдзі правёў чатыры гады ў турме за тое, што абразіў прэзідэнта Мубарака і ісламскія каштоўнасці.

Такая істэрыка вакол эротыкі, натуральна, перапужала ліберaлаў. Яны як мага хутчэй узялі дыстанцыю ад феміністкі, якая нібыта з'яўляецца актывісткай Руху 6-га красавіка (адна з вядучых маладзевых дэмакратычных груповак у краіне). Спікер Руху 6-га красавіка зрабіў заяву для тэлевізійнага каналу Al-Arabija, у якой паінфармаваў, што ў яго арганізацыі няма нікога, хто «мог бы практыкаваць такога кшталту ўчынкі». Ён нават кажа, што Рух 6-га красавіка — гэта аб'яднанне маладых кансерватараў, якія б, па яго словах, ніколі б не прынялі ў свае шэрагі дзяўчыну, якая паводзіць сябе падобным чынам. Дарэчы, у таго руху, здаецца, доўгія рукі. Пасля агучанай заявы лідара арганізацыі Эль-Махдзі напісала, што ніколі не была сябрам Руху 6 красавіка.

Насцярожанасць умераных ліберaлаў цалкам зразумелая. У іх перад вачыма стаіць прыклад Тунісу, дзе на першых пасля дыктатуры свабодных выбарах перамога дасталася ісламістам. Як піша прэса, перамагчы ім дапамог анімацыйны фільм «Персепаліс», які ліберaлы шмат паказвалі па тэлевізіі ў якасці контр-прапаганды ісламскага фундаменталізму. «Персепаліс» — французскі поўнаметражны анімацыйны фільм па аднайменнай аўтабіяграфічнай навеле французскай пісьменніцы іранскага паходжання Маржан Сатрапі. Стужка распавядае пра сумны лёс жанчыны ў Іране пасля перамогі ісламістаў. Вялікая колькасць тунісцаў успрыняла ідэі, выкладзеныя ў стужцы «Персепаліс», як заклік да сексуальнай рэвалюцыі.

Здаецца, егіпецкія ліберaлы ўжо маральна гатовыя прайграць выбары. «International Business Newspaper» цытуе аднаго з актывістаў дэмакратычнага студэнцкага руху ў Каіры: «Фатаграфіі Эль-Махдзі — гэта самая кепская рэч для ліберaльнага руху ў Егіпце. Яе акцыя дазволіць кансерватарам давесці, што яны маюць рацыю. Яе ўчынак дыскрэдытуе ліберaлаў. Такой думкі прытрымліваюцца нават феміністкі».

Праўда, некаторыя фракцыі егіпецкага грамадства і арабскага свету падтрымалі ўчынак Эль-Махдзі. «Рэвалюцыйная феміністка размясціла ў інтэрнэце выявы свайго аголенага цела ў якасці маніфестацыі сваёй свабоды. Я ўражаны яе адвагаю», — такі каментар пакінуў Ахмад Авадала, адзін з лідараў руху за правы чалавека. За феміністку заступілася арабская грамада ў ЗША і шматлікія лідары іранскай палітычнай дыяспары. Адзін з іх кажа, што акцыя Эль-Махдзі — не што іншае, як «абсалютны акт бунту супраць ісламізму». Знайшліся ў яе фанаты і ў асяроддзі егіпецкай артыстычнай субкультуры і журналісцкай супольнасці. На думку адной журналісткі, «сапраўдная рэвалюцыя супраць дыктатуры не можа адбывацца без культурных зменаў, якія ў тым ліку тычацца сэксуальных забабонаў».

А ў Ізраілі ўзнікла нават група паслядоўнікаў Эль-Махдзі. Яе сябры фатаграфуюцца аголенымі і выкладваюць свае выявы ў інтэрнэце з подпісам: «У гонар Аліі Эль-Махдзі. Яе сёстры з Ізраілю».

Між тым, сама Эль-Махдзі праз нейкі час пасля той гісторыі кудысьці знікла. Яна не ўдзельнічае ў дэбатах у інтэрнэце, а ўсе яе тэлефоны не працуюць. І, здаецца, правільна зрабіла. Раней шэраг радыкальных ісламісцкіх сектаў ужо заявілі пра намер забіць дзяўчыну.



Бой-фрэнд Эль-Махдзі Амр Карым і сама Магда Алія




Каля 50 маладых ізраільцянак распрануліся ў падтрымку Эль-Махдзі

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сёння мясцовыя эксперты, аналізуючы сітуацыю, канстатуюць, што і Бяляцкаму, і экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Саннікаву, а таксама іншым палітвязням хуткім часам не наканавана быць вызваленымі. Аляксандр Лукашэнка вырашыў бліжэйшыя эканамічныя праблемы, атрымаўшы ад Расіі танны газ, а гэта значыць, што меркаванне Еўропы і Амерыкі з нагоды ступені яго дэмакратычнасці яму абыякава. Праўда, эканамічныя эксперты сцвярджаюць, што зацішша на расійска-беларускім фронце працягнецца нядоўга, а затым Лукашэнку зноў могуць спатрэбіцца крэдыты і лаяльнасць Захаду. Вось тады палітвязні зноў стануць хадавым таварам.

**«Независимая газета» (Расія)**

Тое, што адбываецца з Беларуссю, відавочна, мае месца не таму, што беларускі прэзідэнт усё жыццё марыў аддаць Расіі «Белтрансгаз». За апошнія некалькі гадоў эканамічная і палітычная мадэль, якую будаваў Аляксандр Лукашэнка, развалілася. Гэта было ясна яшчэ ў першым паўгоддзі бягучага года, калі інфляцыя ў Беларусі была адной з самых вялікіх у свеце. У краіне даражэе паліва, прадукты і г.д. Таму беларускі прэзідэнт ужо не можа пракарміць уласны народ і вымушаны пайсці на ўмовы, якія перад ім высоўвала Расія. Падзецца Лукашэнку было няма куды: або поўная эканамічная катастрофа, або нейкім чынам Расійская дзяржава за пэўныя кампенсацыі дазволіць яму ўтрымацца ў крэсле.

**«GolosUA» (Украіна)**

Мінск атрымаў перадвыбарчую даніну, расійская палітычная эліта не хоча чарговай газавай вайны напярэдадні выбараў.

**«Газета.ру» (Расія)**

Аляксандр Лукашэнка скарыстаўся паўзай паміж палітычнымі пратэстамі ў краіне, каб канчаткова забараніць беларусам збірацца па якой-небудзь нагодзе. Пачынаючы з восені не ўхваленыя мясцовымі органамі ўлады масавыя мерапрыемствы лічацца табу, што нярэдка прыводзіць да абсурдных сітуацый. Так, грамадскае аб'яднанне «Быць цвярозым», якое арганізоўвала ў адным з гарадскіх паркаў прабежку, сутыкнулася з сур'ёзнымі праблемамі. Яны нечакана паўсталі ў асобе двух міліцыянераў, якія пристрашылі затрымаць прыхільнікаў здаровага ладу жыцця за «ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве». Пры гэтым, гаворыцца ў артыкуле, арганізатары прабежак спрабавалі загадзя ўзгадніць правядзенне спартовага мерапрыемства, аднак ім было адмоўлена.

**«Tagesspiegel» (Германія)**

Хоць Еўропа магла гуляць як на прывабнасці сваёй цывілізацыйнай мадэлі, так і на страху Мінска перад тым, што яго праглыне Масква (а Кіева — што Масква атрымае дамінуючую пазіцыю ў яго эканоміцы), Расіі ўжо ўдалося абяззброіць усходнюю палітыку Еўрасаюза, адным з суаўтараў якой была Польшча. Якія могуць быць прэтэнзіі да Пуціна? Ён папросту з халоднай паслядоўнасцю ўвасабляе ў жыццё свае неімперскія планы. У 2008 годзе, пасылаючы ў Грузію танкі, ён прадэманстраваў свету, што здольны абараняць расійскія сферы ўплыву, а цяпер «мірнымі метадамі» заняўся Беларуссю і Украінай. Калі нехта і можа змяніць рэжым у Беларусі ды стаўленне кіеўскіх уладаў да інтэграцыі — дык гэта звычайныя людзі. Гульня за Усход працягваецца, але гэта доўгі шлях, які зойме гады.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. МАСКВУ ЗАСНАВАЛІ ТАТАРЫ

Менавіта так сцвярджае казанскае выдавецтва «Іслам-пресс», якое выдае часопіс, што распаўсюджваюцца ў так званых «халяльных» кавярнях — установах, дзе падаюць прыгатаваныя па ісламскіх канонах стравы. «Заснавальнікам Масквы па праве трэба лічыць баярына, род якога пачынаецца ў Волжскай Булгарыі, Сцяпана Кучку, землі якога ўзурпаваў Юры Далгарукі». Менавіта так сцвярджае аўтар артыкулу Д. Абдрахманаў, не спасылаючыся ні на якія гістарычныя крыніцы. Далей можна даведацца, што, як аказваецца, «менавіта ардынскія ханы дзякуючы палітыцы талерантнасці <...> шмат зрабілі для таго, каб Масква да пачатку XIV стагоддзя стала афіцыйнай сталіцай рускай дзяржавы», і што менавіта «дзякуючы палітыцы залатаардынскіх ханаў купала шматлікіх маскоўскіх цэркваў сталі пакрывацца золатам». Застаецца дадаць, што расійскія нацыяналісты ўжо назвалі публікацыю «фантазіяй».

**Паводле расійскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ВЯРНУЦЬ СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Вядучая польская апазіцыйная партыя «Права і Справядлівасць» (PiS) рашуча выступае за вяртанне смяротнага пакарання ў Крымінальны кодэкс. «У Еўрасаюзе няма інструкцый, якія забараняюць нам рабіць гэта», — сказаў старшыня партыі Яраславаў Качыньскі. Яго нацыянальна-кансерватыўная партыя плануе выступіць у парламенце за змену крымінальнага права і ўвесці смяротнае пакаранне для тых, хто ўчыніў асабліва жорсткія забойствы. «Зараз забойцы сядзяць у Польшчы ў сярэднім 7 гадоў, гвалтаўнікі — 3,5 гады. Гэта сітуацыя, якую трэба мяняць, — сказаў Качыньскі. — Дзяржава існуе, каб ахоўваць звычайных грамадзян. Толькі эліта ЕС — супраць пакарання смерцю. Мы — суверэнная краіна, у нас ёсць права вырашаць усё самастойна». Нагадваем, што падобную пазіцыю адносна смяротнага пакарання падтрымліваў і брат Яраслава, былы прэзідэнт Лех Качыньскі, які загінуў у авіякатастрофе.

**Паводле польскай прэсы**

### УКРАІНА. ЦІГІПКА РАЗДУМАЎ ІСЦІ Ў ПР



Аб'яднанне партыі «Моцная Украіна» (СУ) з Партыяй рэгіёнаў (ПР), якое планавалася на канец лістапада, пераносіцца на нявызначаны тэрмін. Нагадаем, 16 жніўня Сяргей Цігіпка, які на прэзідэнцкіх выбарах 2009 года быў трэцім кандыдатам, нечакана заявіў пра намер «Моцнай Украіны» ўвайсці ў склад Партыі рэгіёнаў. Інфармацыю пацвердзіў і прэм'ер Азараў. Напачатку верасня Цігіпка казаў, што плануе нават стаць лідарам Партыі рэгіёнаў. Аднак, здаецца, яго амбіцыі не маюць падстаў. Як піша прэса, за апошнія некалькі тыдняў СУ і ПР так і не наблізіліся да кампрамісу. Цігіпка, як і раней, хоча атрымаць высокія пасады ва ўрадзе для сваіх людзей, а Партыя рэгіёнаў з гэтым катэгарычна не згодная. Больш таго, час у гэтых перамовах гуляе на карысць ПР. Пакуль бакі гандлююцца, рэйтынг СУ на вачах падае. Так, адпаведна апытанням, «Моцная Украіна» страціла шанцы атрымаць на наступных парламенцкіх выбарах вынік, які дазволіць ёй мець сваю фракцыю. Такім чынам, магчыма, Цігіпку не застанецца нічога іншага, як прымаць умовы партыі Януковіча.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ІСЛАНДЫЯ. НЕ ПУСЦІЛІ КІТАЙ У АРКТЫКУ



Урад Ісландыі адхіліў прапанову аднаго з самых багатых прадпрымальнікаў Кітая, Хуана Нубо пра продаж яму трохсот квадратных кіламетраў ісландскай зямлі. Па словах ісландскіх афіцыйных асобаў, у гісторыі краіны яшчэ не было выпадку продажу замежнікам такой велізарнай тэрыторыі. Хуан Нубо планаваў набыць участак на паўночным узбярэжжы выспы і заснаваць там турыстычны курорт. Некаторыя крытыкі выказалі думку, што гутарка ішла зусім не пра развіццё турыстычнай індустрыі. Гэта дамова дала б Кітаю магчымасць заснаваць стратэгічны плацдарм у Арктыцы, засваенне прыродных рэсурсаў якой выклікае ўсё большую цікавасць.

**Паводле дацкай прэсы**

▸ ЦІКАВА

# ШКІЛЕТ У КАРАЛЕЎСКАЙ ШАФЕ

Алег НОВІКАЎ

**Чарговы скандал разгарэўся вакол брытанскай каралеўскай сям'і. Каралева Елізавета доўгі час хавала ад грамадскасці псіхічна хворых пляменніц, якія амаль усё жыццё правялі ў ізаляцыі.**





Гэта скандальная гісторыя пачала раскручвацца ў кастрычніку, калі каралева Елізавета наведала адну з лонданскіх псіхіятрычных клінік. Візіт — так сабе, традыцыйны, афіцыёзны, па сутнасці, для пратаколу. Толькі для таго, каб сфатаграфавацца на фоне пацыентаў і медычнага персаналу. Але менавіта там Яе Вялікасць зрабіла прамову пра неабходнасць радыкальных змен у стаўленні да псіхічна нездаровых людзей — да гуманітарнай рэвалюцыі ў псіхіятрыі.

Тады на той спіч не звярнулі вялікай увагі. Затое зараз згаданая вышэй заява выклікае ў Вялікабрытаніі хвалю сарказму і сацыяльнага абурэння. Справа ў тым, што надоечы каралева выступіла супраць дэманстрацыі на канале BBC дакументальнага фільму пра сваіх кузін, якіх яе сям'я адправіла ў псіхіятрычны шпіталь аж у 1941 годзе і пасля намагалася, паводле аўтараў стужкі, ніколі не ўзгадваць. Каралева лічыць, што гэты фільм супярэчыць грамадскім інтарэсам.

Гаворка ў фільме ідзе пра пляменніц каралевы — Кэтрын і Нерысу Боуз-Лаён. Першая нарадзілася ў 1919-м, а другая — у 1926 годзе.

Дзяўчынкі мелі праблемы з псіхікай, і ў 1941-м былі адпраўленыя ў спецыяльны пансіянат Earlswood Hospital для тых, хто пакутуе на падобныя хваробы. У прынцыпе, праблема псіхічна хворых сяброў каралеўская сям'і не была на той момант чымсьці экстравагантным. У 1905 годзе ў караля Георга V і каралевы Марыі нарадзіўся прынц Джон. Спачатку яго разглядалі нават як магчымага прэтэндэнта на трон. Але хутка прынц Джон стаў пакутаваць на эпілептычныя прыпадкі, што вельмі перапужала бацькоў.

Праз некаторы час прынц Джон знік з афіцыйных фотаздымкаў каралеўскай сям'і. Яму нават не было дазволена прысутнічаць на каранацыі бацькі ў 1911 годзе. Напачатку 1917 года, баючыся таго, што хвароба прынца Джона атрымае медыя-рэзананс, яго выдалілі з каралеўскага двару і адправілі ў высылку ў адзін правінцыйны замак разам з нянькай і дзвюма слугамі. Апошнія павінны былі сачыць, каб прынц не памёр падчас прыпадкаў. Аднак дагледзіць не змаглі. Праз два гады прынц Джон усё ж памёр.

Высылка Кэтрын і Нерысы — з той жа оперы. Дакументальны фільм, пра які ідзе гаворка вышэй, шмат распавядае пра тое, што іх двойчы — у 1940 і 1963 гадах — абвяшчалі нябожчыцамі. Апошні раз журналістам дазволілі наведаць сёстраў у 1960 годзе. Пасля гэтага ўсялякія наведванні былі забароныя.

Асобная тэма — стаўленне каралеўскай сям'і да сваіх хворых родных. Брытанскае грамадства больш за ўсё абурыла тое, што Елізавета ніколі не дасылала сёстрам віншавальныя паштоўкі на Каляды. Акрамя таго, як сцвярджаюць аўтары фільму, каралеўская сям'я ніколі не наведвала медычную ўстанову. У той жа час, калі верыць рэжысёру, каралеўская сям'я была ў курсе сітуацыі, аднак была зацікаўленая ў тым, каб жанчын тайна трымалі ў ізаляцыі.

Нельга без эмоцый слухаць у фільме інтэрв'ю жанчыны, якая выконвала ролю нянькі ў Earlswood Hospital: «Калі каралева ці каралева-маці з'яўляліся на экране тэлевізара, сёстры заўсёды рабілі рэверанс — вельмі каралеўскі, вельмі нізка. Відавочна, тое была свайго роду памяць. Гэта было настолькі сумна… Толькі падумайце пра жыццё, якое яны, магчыма, мелі. Яны былі дзвюма выдатнымі сёстрамі. У іх былі праблемы з тым, каб размаўляць. Аднак заўсёды можна было зразумець, што яны спрабавалі сказаць. Яны разумелі больш, чым здавалася спачатку».

Калі Нерыса памерла ў 1987 годзе, ніхто з каралеўскай сям'і нават не прысутнічаў на пахаванні. Больш таго, да 1987-га яны нават не прызнавалі само існаванне сясцёр. Толькі пасля смерці адна з нябожчыц была занесена ў спіс у якасці «асобы, якая памерла» ў «Хто ёсць хто сярод брытанскай арыстакратыі».

Каралеўская сям'я пакуль не можа растлумачыць, чаму так адбылося. Па слядах выхаду фільма каралеўскі двор зрабіў шэраг заяў. Елізавета II сцвярджае, што сістэматычна цікавілася станам Кэтрын і Нерысы і дасылала ім віншавальныя паштоўкі.

Заявы каралевы наконт любові да родзічаў не ўспрымаюцца сур'ёзна з-за лёсу яшчэ адной сястры Елізаветы — Эдоніі Фэйн. Тая таксама з-за псіхічнай хваробы нейкі час ляжала ў клініцы. Пасля яна пакінула сцены псіхіятрычнага шпіталя і памерла ў 2002 годзе. Букінгемскі палац праігнараваў факт смерці. Толькі праз нейкі час на яе магіле быў пастаўлены танны помнік.

Рэакцыя грамадства на шуміху ў прэсе вакол псіхічна хворых родных у большасці негатыўная. Каралеўская сям'я, нягледзячы на тое, што валодае велізарнымі багаццямі, палацамі і маёнткамі, зачыніла сваіх сваякоў на 70 гадоў у псіхіятрычнай лякарні і пакінула на смерць. Не кажучы пра тое, што нават іх існаванне адмаўляла.

Левая прэса ўвогуле сцвярджае, што жанчынам паставілі няправільны дыягназ. Іх ментальную адсталасць у развіцці быццам можа было лячыць, аднак усё вырашыў дыктат каралевы-маці. Цяжка сказаць, наколькі гэта праўда, паколькі персанал Earlswood Hospital кажа, што па свайму псіхічнаму развіццю сёстры да самага канца жыцця засталіся на ўзроўні падлеткаў.

У прынцыпе, у іншы час, магчыма, навіну пра некаторыя асаблівасці сямейнай этыкі каралеўскай дынастыі ўспрынялі б не так адмоўна. Аднак цяпер на двары вельмі смутны час, і нават традыцыйныя інстытуты, кшталту каралеўскай сям'і, сталі аб'ектамі крытыкі. Пра гэта сведчыць пазіцыя адной з самых жоўтых у краіне газет «Dailymail», якая стала рупарам антыкаралеўскай кампаніі. Што тычыцца больш левых газет, то для іх гісторыя — яшчэ адзін доказ таго, што брытанская манархія — гэта рудымент гісторыі.

Між тым, гісторыкі лічаць, што сёстры сталі ахвярамі часу. «Сёстрам не пашанцавала нарадзіцца ў эру, калі псіхічная адсталасць трактавалася як пагроза грамадству і была нават сінонімам нейкага малога злачынства або прыналежнасці да класу люмпенаў. Яны нарадзіліся ў эру, калі былі папулярныя тэорыі еўгенікі (вучэння пра селекцыю ў дачыненні да чалавека). У той час, калі ў вас нараджалася псіхічна хворае дзіця, лічылася, што ваша сямейнае жыццё не склалася», — кажа адзін з гісторыкаў.

ВЕРСІІ

# ХТО ЗА КІМ САЧЫЎ?

Алег НОВІКАЎ

**Як высвятляецца, удзельнікі самай буйной правай тэрарыстычнай арганізацыі ФРГ былі тайнымі агентамі нямецкай спецслужбы — так званымі фаў-людзьмі. Узнікае пытанне: ці не дзейнічалі тыя фаў-людзі адпаведна інструкцыям куратараў?**



4 лістапада свет бюргераў невялікага і ціхага цюрынгскага гораду Айзенах быў парушаны. У палове дзясятай раніцы ў адно з раённых аддзяленняў банка Sparkasse уварваліся ўзброеныя мужчыны ў масках. Працаўнікі банка беспярэчна выдалі ім буйную суму грошай, пасля чаго гангстары зніклі. Паводле расповедаў сведак, бандыты з'ехалі на невялікім аўтафургоне.

Неўзабаве паліцыя знайшла падобны фургон. Паліцэйскія асцярожна набліжаліся да падазронай машыны, калі ўсярэдзіне яе адбыліся стрэлы, пасля чаго фургон загарэўся. Агонь патушылі і знайшлі абгарэлыя целы двух маладых людзей, што, як пазней высветлілася, фігуравалі ў файлах паліцыі як небяспечныя правыя экстрэмісты. У згарэлай машыне таксама знайшлі службовыя пісталеты, якія належалі забітай у 2007 годзе супрацоўніцы паліцыі.

Праз тры гадзіны ў суседняй з Цюрынгіяй федэральнай зямлі Саксонія ў горадзе Цвікау падарвалі жылы дом, дзе, як аказалася, пражывалі працаўнікі банку ў Айзенаху. Выбух учыніў самазабойца. На месцы пажару выявілі кампактны склад зброі, неанацысцкую сімволіку, электронныя інфармацыйныя носьбіты. У тым ліку DVD з відэа-маніфестам тэрарыстаў. На стужцы яны называлі сябе «Нацыянал-сацыялістычнае падполле», прызнаваліся ў забойствах групы турэцкіх бізнэсоўцаў. Нарэшце, пагражалі новымі актамі тэрору.

Аднак самай цікавай знаходкай аказаліся так званыя «легальна-нелегальныя» пашпарты — фіктыўныя дакументы, што выдаюцца сакрэтным агентам Службы абароны канстытуцыі (BfV). У Германіі іх завуць фаў-людзьмі — ад алфавітнай назвы першай літары V у слове Verfassungsschutz («абарона канстытуцыі»). Звычайна такіх фаў-людзей больш за ўсё ў асяроддзі неанацыстаў. Лічыцца, што гэта дазваляе кантраляваць праварадыкальную сцэну. Так ці інакш, аказалася, што дзяржаўная служба была нейкім чынам звязаная з неанацыстамі.

Большасць аналітыкаў схіляецца да версіі, што BfV проста заблыталася ў сваіх аперацыях. Служба вербавала інфарматараў сярод нацыстаў, якія, у сваю чаргу, навучыліся выкарыстоўваць BfV у сваіх мэтах.

«Ужо незразумела, хто за кім сачыў, — з'едліва заўважыў у сваім выступе ў Бундэстагу на мінулым тыдні Грэгар Гізі, адзін з лідараў Левай партыі, — ці то абаронцы канстытуцыі за неанацыстамі, ці то неанацысты — за абаронцамі канстытуцыі?» На хвалі недаверу да BfV партыя Зялёных нават прапанавала раздаць бюджэтныя сродкі, якія ішлі на фінансаванне службы, грамадскім арганізацыям.

Адначасова з'явілася думка, што неанацысты маглі дзейнічаць калі з не санкцыі, то з маўклівай падтрымкі нямецкіх спецслужбаў.

Левыя выданні ўзгадваюць, што ідэя стварэння ў 1950 годзе Федэральнай службы абароны Канстытуцыі ўзнікла ў штабе амерыканскіх войскаў, якія стаялі ў адной з акупацыйных зонаў. Заакіянскія вайскоўцы баяліся, што СССР можа выкарыстаць структуру Камуністычнай партыі Германіі як агентурную сетку. Таму лагічна ўзнікла патрэба трымаць усіх камуністаў пад каўпаком. Відавочна, што лепшых антыкамуністаў, чым былых супрацоўнікаў нацысцкай палітычнай паліцыі, было цяжка знайсці. У 2009 годзе старшыня BfV Хайнц Фром прызнаў, што да 1955 года існавала практыка неафіцыйна працягваць да супрацоўніцтва былых агентаў Гестапа.

Росту латэнтных сімпатый да нацызму сярод сілавікоў, на думку левых газет, спрыяла так званая Нямецкая восень — час жорсткага супрацьстаяння паліцыі і левых тэрарыстаў у 1970-я гады. Баевікі ў тэкстах сваіх пракламацый адкрыта называлі ФРГ дзяржаваў-пераемніцай нацысцкай Германіі, а дзяржаўных супрацоўнікаў — фашыстамі. У 1980-я левыя арганізацыі стварылі ініцыятыву Burger beobachten die Polizei. Яго актывісты спрабавалі весці назіранне і маніторынг дзейнасці сілавых структур, у тым ліку BfV.

У гэтым плане куды далей ідуць правыя выданні. На іх думку, 4 лістапада мела месца спланаваная дзяржаўная правакацыя супраць правай палітычнай сцэны. Пытанне, як дыстантавацца ад забойцаў з Цвікау, сёння самае важнае для правых партый. Можна згадаць, колькі электаральных абвалаў каштавала іх нарвежскім калегам з Партыі прагрэсу выхадка вар'ята Брэйвіка.

Пра тое, што адбылася правакацыя, як лічаць правыя, сведчаць некаторыя недарэчнасці справы. Чаму тэрарысты пасля паспяховага рабавання банку спрабавалі пакончыць з сабой? Пры гэтым дзіўна, чаму яны стралялі не ў галаву? Чаму ў прынцыпе яны вырашылі страляцца, а не паспрабавалі выкарыстаць судовы працэс для папулярызацыі сваіх поглядаў? Выбар на карысць суіцыду нелагічны, калі згадаць той самы DVD з маніфестам. Ёсць незразумелыя фрагменты і ў гісторыі групы. Па паліцэйскіх дадзеных, банда займаліся забойствамі турэцкіх бізнэсоўцаў да 2006 года, а пасля гэтага пераключыліся на рабаванне банкаў. Адсюль лагічнае пытанне, на якія сродкі жыла шайка ў перыяд, калі спецыялізавалася на палітычным тэроры?

Адным словам, атрымліваецца, што тройцу з Цвікау папросту падставілі. Пытанне, нашто? Наконт гэтага ўжо хапае версій. Магчыма, мела месца спроба адвесці цікавасць ад дзейнасці турэцкіх спецслужбаў у ФРГ, якія і забівалі тых турэцкіх прадпрымальнікаў. Гаворка ідзе пра групоўкі «Шэрыя ваўкі» і «Ergenekon». Гэта звязаныя з Анкарой турэцкія нацыяналістычныя арганізацыі, якія вядуць на тэрыторыі Германіі неабвешчаную вайну з курдскай дыяспарай, якая дапамагае партызанам з Рабочай партыі Курдыстану і турэцкай марксісцка-ленінскай ваеннай арганізацыяй Dev Sol. Апошнія маюць сваю сетку кафэ для адмывання грошай. Тыя ж «Шэрыя ваўкі», забіўшы сваіх палітычных апанентаў, маглі прадаць або падкінуць зброю неанацыстам.

Яшчэ больш сенсацыйную версію прапануе выданне «Seccion»: «Выяўленне неанацысцкай тэрарыстычнай сеткі павінна адцягнуць увагу грамадства ад сітуацыі ў эканоміцы, накіраваць немцаў да вечнай тэмы Гітлера ў сярэдзіне нас. …Жупел правага тэрарызму абнаўляе і ўзмацняе ў народзе траўму нацыянал-сацыялізму, развівае комплекс віны. Гэта адбываецца на фоне таго, як расце гонар нацыі за сваю эканоміку, якая выглядае лепш грэчаскай, італьянскай і нават амерыканскай. Неабходны ўдар фашызмам па галаве, каб немцы забыліся пра годнасць і зноў сталі асцярожным народам».

Усе такога кшталту тэорыі выглядаюць занадта фантастычнымі, аднак пакуль не будзе комплекснага адказу на пытанні, звязаныя з дзейнасцю «Нацыянал-сацыялістычнага падполля» і фармату яго кантактаў з BfV, наўрад ці трэба чакаць маштабных рэформаў у гэтай галіне. Як сведчыць вопыт фаў-людзей, простых і хуткіх рэцэптаў у барацьбе з правым тэрарызмам не бывае.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЮРЫЙ БОЛДЫРАЎ



Дэпутат украінскай Вярхоўнай рады ад Партыі рэгіёнаў прапанаваў перагледзець пакт Молатава—Рыбентропа, а дакладней, вывесці са складу Украіны Галіцыю, якая стала часткай Украінскай ССР у 1939-м дзякуючы падзелу Польшчы паміж СССР і Германіяй. Па меркаванню дэпутата, праблема палягае ў тым, што Украіна «злеплена» з розных па гісторыі і менталітэту кавалкаў, што прыводзіць да сталых ваганняў, і, як следства, краіна не можа развівацца. У тым ліку як дэмакратычная краіна, паколькі, па словах Болдырава, «у адных межах утрымліваць Галіцыю і Данбас, Галіцыю і Крым можна толькі сілай». Па яго словах, такі палітычны рэжым могуць дазволіць сябе толькі людзі кшталту Сталіна, аднак не дэмакраты. Кіраўніцтва фракцыі Партыі рэгіёнаў у Вярхоўнай радзе Украіны ўжо заявіла, што меркаванне Юрыя Болдырава не адлюстроўвае пазіцыю Партыі рэгіёнаў у цэлым. «Гэта асабістая імправізацыя Юрыя Болдырава», — гаворыцца ў заяве. Рэзанансную заяву пракаментавалі і ў апазіцыі. У прыватнасці, паплечнік Цімашэнка Сяргей Пашынскі заявіў: «Думаю, трэба тэрмінова стварыць медыцынскую камісію і абследаваць Болдырава на прадмет псіхічнай нармальнасці». А вось нацыяналісты з Заходняй Украіны чамусьці ў якасці рэакцыі на ідэі дэпутата ад Партыі рэгіёнаў узгадалі нейкага галіцкага ваяводу XIII стагоддзя, якога Даніла Галіцкі паставіў кіраваць Кіевам. На іх думку, гэта доказ таго, што Украінай павінен кіраваць выключна выхадзец з Галіцыі.

### ЯНУШ ПАЛІКОТ



Лідар партыі «Рух падтрымкі Палікота» нарабіў вялікага шуму пасля таго, як на выбарах у кастрычніку на антыклерыкальных лозунгах нечакана для ўсіх атрымаў 10 працэнтаў. Такім чынам, яго «Рух падтрымкі Палікота» стаў вядучай партыяй, якая знаходзіцца лявей за права-цэнтрысцкую Грамадзянскую платформу. Гэта выклікала шмат спекуляцый наконт таго, што за фармацыю збіраецца будаваць Януш — ліберальную, ліберальна-левую (Зялёныя) або левую. І вось цяпер выбар, здаецца, зроблены. «Рух падтрымкі Палікота» пачынае супрацоўніцтва з Аб'яднаннем лібералаў на карысць Еўропы (ALDE). Такое рашэнне было прынятае пасля сустрэчы Палікота з Гі Верхофштадтам — адным з лідараў ALDE, былым прэм'ерам Чэхіі. ALDE — трэцяя па колькасці дэпутатаў фракцыя ў парламенце ЕС. Раней у яе ўваходзілі польскія партыі Унія вольнасці і Дэмакратычная партыя. Аналітыкі пішуць, што каапераця з ALDE — някепскі крок з пункту гледжання палітычнага прагматызму, аднак ён можа выклікаць канфрантацыю ўнутры «Руху падтрымкі Палікота». Раней праект Палікота падтрымала шэраг актывістаў ініцыятыў левага накірунку. Відавочна, што яны не ў захапленні ад ідэі ператварыцца ў лібералаў. Затое ліберальны выбар Палікота — пазітыўна навіна для посткамуністычнага Саюзу левых дэмакратаў (SLD), які баяўся атрымаць канкурэнта на левым флангу. Праўда, шмат залежыць ад таго, каго левыя абяруць у якасці новага старшыні. Выбары новага кіраўніка SLD адбудуцца 10 снежня.

### ДАРЫГА НАЗАРБАЕВА



Старэйшая дачка казахскага прэзідэнта падчас 14-га з'езду партыі «Нур Атан» трапіла ў завернджаны прысутнымі партыйны спіс па выбарах дэпутатаў парламента. Гэта значыць, што Дарыга атрымала ад бацькі прабачэнне за свае кантакты з апазіцыяй і вяртаецца ў палітыку. Нагадаем, што яна была жонкай Рахата Аліева — галоўнага апанента рэжыму, які зараз хаваецца ў Вене. Пасля таго, як Аліеў адкрыта пачаў крытыкаваць Назарбаева за аўтарытарызм, Дарыга нейкі час падтрымлівала мужа, аднак пасля пад ціскам атачэння прэзідэнта запатрабавала развод. Пасля гэтага яна практычна не з'яўлялася на публіцы. І вось цяпер зноў падалася ў палітыку. Эксперты нават не выключаюць, што менавіта Дарыга можа стаць тым самым пераемнікам Назарбаева, імя якога ён быццам агучыць пасля парламенцкіх выбараў. Сапраўды, калі меркаваць па каментарах на казахскіх форумах, стаўленне да яе не такое адмоўнае, як да іншых прадстаўнікоў прэзідэнцкага клуба. Яна мае гістарычную адукацыю, валодае замежнымі мовамі і мае вопыт палітычнай працы.

ЦІКАВА

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ

## (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)

Працяг.
Пачатак у №42–44.

Анатоль Валахановіч

**У інструкцыі ад 21 мая 1941 года, якая тычылася кіравання ва ўсходніх раёнах («Зялёная папка»), гаварылася: «Многія мільёны людзей стануць лішнімі на гэтай тэрыторыі, яны павінны будуць памерці ці перасяліцца ў Сібір». Паводле генеральнага плана «Ост», прадугледжвалася «высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі». «Значыць, — указвалася ў гэтым дакуменце, — 25 працэнтаў беларусаў па плану галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягае анямечванню».**



Інаўгурацыя гаўляйтара Вільгельма Кубэ

### Новы парадак

Акупаваўшы Беларусь, гітлераўцы абвясцілі аб ліквідацыі Беларускай ССР, савецкай улады і ўсяго астатняга. Яны ўвялі свой адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай абласцей, а таксама некаторыя раёны РСФСР і Украіны, былі аднесены да «вобласці армейскага тылу» групы армій «Цэнтр». Мяжа тылавога раёна групы армій «Цэнтр» па стану на 15 красавіка 1942 года праходзіла па лініі Смаленск — Віцебск — Новасакольнікі — Дрыса — Барысаў — на захад ад Бабруйска — на поўдзень ад Гомеля — Почап — Рослаў.

Амаль поўнасцю Палеская, Пінская і Брэсцкая вобласці з абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск і Брэст былі далучаны да «рэйхскамісарыята Украіны», мяжа якога праходзіла прыкладна за 20 кіламетраў на поўнач ад чыгункі Брэст — Гомель. Былую Беластоцкую і паўночныя раёны Брэсцкай вобласці ўключылі ў склад Заходняй Прусіі. Паўночна-заходнія раёны былой Вілейскай вобласці знаходзіліся ў «генеральнай акрузе Літва».

Другая частка Беларусі — «генералбецырк Беларутэнія» (генеральная акруга Беларусь) — складалася з Баранавіцкай, часткі Мінскай і Вілейскай абласцей, паўночных раёнаў Пінскай вобласці і часткова Брэсцкай. У 1941 годзе ў генеральную акругу Беларусі ўваходзілі 68 раёнаў (з агульнай колькасці 192 сельскіх і 9 гарадскіх раёнаў), якія былі ў складзе БССР да вайны.

Яна была падзелена на 10 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую (большая яе частка ўваходзіла ў вобласць аховы тылу групы армій «Цэнтр»), Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую і Слуцкую. У кожнай акрузе было некалькі раёнаў (крайсаў), якія складаліся з валасцяў, а валасці ў сваю чаргу аб'ядноўвалі некалькі вёсак і іншых населеных пунктаў.

«Генеральная акруга Беларусь» разам з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй уваходзіла ў склад «рэйхскамісарыята Остланд» з адміністрацыйным цэнтрам у Рызе.

І вось на чале вышэйшага органа акупацыйнай улады — «генеральнага камісарыята Беларусі» — быў пастаўлены гаўляйтар Вільгельм Кубэ. Ствараўся адміністрацыйны апарат і на месцах: у акругах — гебітскамісарыяты, у гарадах — штадскамісарыяты. На шматлікія пасады «камісараў», «камендантаў», «крайсляндвіртаў» (раённых упаўнаважаных), «інспектараў», «ваенных аграномаў», «зондэрфюрэраў» прызначаліся нямецкія чыноўнікі.

Дзейнічаў і велізарны ваеннапаліцэйскі апарат, на які ў сваёй дзейнасці апіраліся цывільныя органы.

### Бабы згуртаваліся?

У маі 1943 года Народны камісар дзяржаўнай бяспекі БССР Л.Ф. Цанава накіраваў Народнаму камісару дзяржаўнай бяспекі СССР У.М. Мяркулаву дакладную запіску аб прыцягненні да забойства В. Кубэ агента «Іванова» (Антона Адамовіча), агента «Казбіч» (паэтку Наталлю Арсенневу), Канстанціна Езавітава і мужа Наталлі Арсенневай — Францішка Кушаля. Але агенты адмовіліся працаваць.

Час ішоў, а ніхто — ні партызаны, ні чэкісты, ні камуністы і іншыя — так і не здолелі расправіцца з Кубэ, і тады за падрыхтоўку забойства гаўляйтара актыўна ўзяліся некалькі жанчын.

Прынятая ў савецкай гістарыяграфіі думка, што агульнае кіраўніцтва і каардынацыю дзеянняў у гэтым пытанні нібыта ўзначальваў Цэнтр, мінскія абласны і гарадскі камітэты КП(б) Беларусі, ніколі не абвяргалася. Але і дакументы, і матэрыялы, якія ніколі не ўводзіліся ў навуковы абарот, сведчаць аб тым, што гэты пункт гледжання трэба перагледзець.

Пакаралі Кубэ, рызыкуючы жыццём, звычайныя беларускія жанчыны — М.Б. Осіпава, А.Р. Мазанік і Н.В. Траян. Толькі пасля вайны ім былі прынятыя ў КПСС, і толькі таму, што ім было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза.

Осіпава была сувязной трох спецатрадаў — С.А. Ваўпшасава, П.Р. Лапаціна, І.І. Залатара. І менавіта Осіпава, як паказваюць рассакрэчаныя дакументы, прыцягнула Мазанік да аперацыі па замаху на Кубэ і, з улікам абставін, што склаліся, проста прымусіла яе даць згоду падкласці міну ў ложак гаўляйтара Беларусі.

Кіраўніцтва партызанскага атрада «Дзіма» ведала, што Осіпава звязана з іншымі аператыўнымі групамі НКУС, якія таксама «палявалі» на Кубэ. Але жанчыне было загадана часова спыніць з імі любыя кантакты.

Марыя хадзіла на сувязь пад выглядам мянялы. З горада Мінска яна несла паношанае адзенне, быццам бы мяняць на хлеб, а на самай справе ў ім былі зашыты патрэбныя звесткі. З вёскі Янушкавічы Лагойскага раёна (гэта значыць, з партызанскага атрада «Дзіма») вярталася з прадуктамі харчавання, нібы для продажу, а пад прадуктамі часта праносіла ўлёткі і выбухоўку.

На гэты раз, атрымаўшы ў партызанскім атрадзе «Дзіма» дзве невялікія міны, Осіпава паклала іх у кошык, засыпала брусніцамі, зверху паклала яйкі і вараную курыцу і накіравалася ў Мінск.

Гэта было вераснёўскім вечарам 1943 года.

Пры падыходзе да нямецкага паста Осіпава разбіла пару яек, акуратна заліла ягады і яйкі. Каму захочацца есці такія брусніцы, аблітыя яйкамі?

Каля Мінска спынілі паліцэйскія. Вось як расказвала пра гэта Марыя:

«Чего несешь?» — спросили полицаи. Я сделала глуповатую физиономию. Хотя она у меня и так не особо умна, пожала плечами и говорю, что несу ягоды, яички и курицу. Один из полицейских спросил: «Что под ягодами?» Я улыбнулась глуповато и говорю: «Да что там может быть?» Полицейский приказал высыпать ягоды из корзины я стала плакаться, что детей у меня много, а ягоды перепачкаются в песке, у меня их никто не купит. Откупилась от полицейских курицей, яйцами и 25 марками. После этого еле дошла до места, так как была в состоянии стресса».

Ведаючы аб тым, што Алена Мазанік мае доступ у пакой, дзе працуе і адпачывае Кубэ, кіраўніцтвам партызанскай брыгады «Дзядя Коля» (камандзір — капітан НКУС П.Г. Лапацін) была зроблена спроба выкарыстаць гэта.

Першай выйшла на Мазанік з прапановай ліквідаваць гаўляйтара рэзідэнт разведвальнага аддзела 4-й партызанскай брыгады «Дзяди Коли» Надзея Віктараўна Траян.

Мазанік, успамінаючы тую сустрэчу з Траян, пісала: «Надя сразу сказала, что она из партизанского отряда и пришла предложить мне задание — убить Кубе. «Согласна ли ты на это?» — спросила она. Я тут же дала согласие, хотя не была уверена, что Надя действительно пришла от партизан».

Але пазней, спалохаўшыся, што Траян магла быць агентам гестапа, Мазанік стала пазбягаць з ёй сустрэч і ў хуткім часе спыніла ўсялякую сувязь.

«Твёрдой и надёжной явилась связь с Марией Осиповой и через Николая Похлебаева. Когда сестра познакомила меня с Николаем, я почему-то сразу почувствовала большую симпатию к этому человеку. Он, Николай-то, и познакомил меня с Марией Осиповой. Он отрекомендовал ее как связную из отряда «Дима», причем сказал прямо: «Девушки (он имел в виду меня и сестру), я вам доверяю и открою вам секрет: я с Осиповой встречался несколько раз в отряде «Дима», и мы оба получили там задания. Конечно, они различны, но цель одна — борьба с врагом, надеюсь, что и вы будете нам помогать». Я ответила: «Спасибо за доверие, будем работать сообща»… Как-то в солнечный день я с Валентиной спустились по Потемкинской лестнице к реке Свислочь. Здесь нас ждали Николай с Марией, они прогуливались под руку, будто влюбленная пара. Мы подошли к ним, поздоровались как со старыми друзьями, хотя я видела Марию впервые. Николай с Валентиной отошли, а мы с Марией стали говорить о деле. Мария на меня произвела хорошее впечатление, она была спокойной, серьезной женщиной. Когда я ей сказала, что начну подготовку при условии, если они с Валентиной сходят в отряд вместе, Мария охотно согласилась», — пісала Мазанік.

Але крыху іншую карціну бачым у расказе Осіпавай: «Я с Галей отошла в одну сторону, а Валя с Николаем в другую. Я Гале сказала, что у меня с ними разговор будет короткий. Николай вас, очевидно, предупредил, с кем он вас знакомит, и что я от вас хочу. У меня была взята с собой отрава. Я думала передать ее Гале, но она мне сказала, что Николаю не доверяет, а меня вообще не знает, хочет видеть кого-либо из начальства отряда. После этого она рассказала, что к ней приходила какая-то Надя и что Надя вызывает у нее подозрение своим поведением, так как открыто носит по городу листовки и держит себя развязно».

Як бачым, два апавяданні аб адным і тым жа эпізодзе значна адрозніваюцца. Трэба адзначыць, што ўспаміны Осіпавай больш аб'ектыўныя і максімальна набліжаныя да тых складаных аператыўных абставінаў у акупаваным Мінску.

Аб'ектыўныя і засцярогі Мазанік, якая хацела дакладна ведаць, што з ёй выйшлі на сувязь менавіта прадстаўнікі партызан. Працуючы працяглы час у канцыляры гаўляйтара, яна, магчыма, ведала, што нямецка-фашысцкія спецслужбы мелі разгалінаваную агентуру з ліку мясцовых жыхароў. І яна, канешне, баялася, што да яе могуць падаслаць агентаў нямецкага гестапа для выяўлення яе добранадзейнасці.

На пытанне Осіпавай, чаму сёстры не прыйшлі на першую сустрэчу, Мазанік заявіла, што яны былі на базары і там затрымаліся.

Магчыма, за тое, што Осіпава «властно» прымусіла забіць Кубэ, Мазанік на яе пакрыўдзілася. І з гэтым не магла змірыцца, відаць, да канца сваіх дзён. Дарэчы, гэта пазней пацвердзілася: Осіпава ўвесь час лічыла сябе галоўнай у аперацыі «Кабан» (так звалася акцыя па ліквідацыі Кубэ), а Мазанік у гэтым адыгрывала, паводле яе доваду, толькі ролю тэхнічнага выканаўцы.

Зразумеўшы, што размова з Аленай Мазанік можа скончыцца безвынікова, Осіпава сказала ёй: «Закончыцца вайна, нехта з нас застанецца жывы, тады мы будзем расказваць і пісаць справаздачы, як, хто і дзе ваяваў у партызанскім руху, на франтах вайны, у антыфашысцкім падполлі і набліжаў перамогу над нямецка-фашысцкімі акупантамі, і спытаюцца ў нас. Што мы ім адкажам, і што мы ім раскажам? А мы ж жылі на акупаванай тэрыторыі!»

Пад гэтай звычайнай патрыятычнай тырадаю патаемна праслізнула пагроза фізічнай расправы за адмову ад супрацоўніцтва з партызанамі. А як партызаны распраўляюцца са здраднікамі, Мазанік таксама было добра вядома. І яна адразу дала згоду забіць Кубэ.

На момант падрыхтоўкі забойства В.Кубэ на акупаванай тэрыторыі Беларусі было вядома, што ў той час ужо адбыўся карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. Перамогі Чырвонай арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе былі вядомы і ў Беларусі. Ліквідацыя В. Кубэ стала загадам Цэнтра для ўсіх партызанскіх фарміраванняў. Забойства Кубэ асабіста ініцыяваў Сталін.

Дамоўленасць з членамі выканаўцам тэрарыстычнага акта была дасягнутая. Засталося толькі даставіць з партызанскага атрада міны і перадаць іх Мазанік. Узнікла пытанне, якое непакоіла гісторыкаў айчынных спецслужбаў: хто прыклаў руку да забойства гаўляйтара — ваенная разведка, органы дзяржаўнай бяспекі ці партызанскія фарміраванні?

Самай апошняй інстанцыяй, дзе Осіпава атрымала міны, быў спецатрад «Дзіма» Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага штаба Чырвонай арміі, які дзейнічаў у Лагойскім раёне і якім кіравалі Д. Кеймах, К. Карніенка, М. Фёдараў. Гэта значыць, што да забойства гаўляйтара «прыклала руку» ваенная разведка. Яны распрацавалі план забойства Кубэ, і Фёдараў перадаў міны Осіпавай, якая перадала адну міну з рук у рукі Мазанік.

Працяг у наступным нумары

КІНО

# ДРАЎЛЯНЫ НАРОД

Алесь ЛАПО

**Даўно ў беларускім дакументальным кіно не з'яўлялася фільмаў, пра якія ўжо зараз можна гаварыць як пра падзею. Фільм «Драўляны народ» Віктара Аслюка, прэм'ерны паказ якога адбыўся па-за конкурсам XVIII ММК «Лістапад», мае добрую глядацкую і фестывальную перспектыву.**

## Аўтар антыўтопій

Віктар Аслюк — вядучы айчынны дакументаліст, вядомы сваімі змрочнымі, поўнымі безвыходнасці і трагізму кінаметафарамі. Шлях да міжнароднага прызнання яму адкрыў фільм «Мы жывем на краі» (2002) — густоўнае папярэджанне пра співанне, страту каштоўнасцяў сялянамі як асноўныя прычыны смерці беларускай вёскі. Пад будзённыя і філасофскія развагі вяскоўцаў саму вёску, дом за домам, паглынае рака... Фільм не толькі даў міжнародную вядомасць і сяброўства ў Еўрапейскай кінаакадэміі яго аўтару, але і быў прызнаны лепшым еўрапейскім фільмам года. Дадаткова стужка назбірала болей за 15 узнагарод на кінафестывалях свету.

Не меншы фестывальны поспех мела наступная стужка «Кола» (2004). Аслюк зноў узднімае тэму гібелі вёскі, зноў атасамлівае яе са смерцю нацыі, аднак на гэты раз дорыць надзею. На фоне змроку і хаўтураў вясковага жыцця светлым промнем выглядае маладая сям'я з дзіцём і іх дагледжаная гаспадарка. Толькі надзея на калазварот жыццёвасці і гаспадарлівасці разбіваецца аб суровую рэальнасць. Працяг гісторыі застаецца за кадрам, аднак ён красамоўны: хутка хата маладых згарэла: яе падпалілі. Сям'я пераехала ў сталіцу, а памерлая вёска з перыяду здымак паспела парасці быльнягом і кустоўем.

## Кіно, якое просіць душа

З часу першых фестывальных поспехаў Віктар Аслюк відавочна змяніўся. Ён шукае пазітыўных герояў, усё часцей задаецца пытаннямі прызначэння мастака і мастацтва, знаходзіць прыгожае ў будзённым, а яго фільмы ўсё часцей выклікаюць не саркастычны, а сапраўдны шчыры смех. Аслюк не прымае кан'юнктурнага кіно: кажа, што не трэба постсавецкім аўтарам у адказ на чаканні заходняга свету здымаць змрочнае і безнадзейнае кіно. Трэба рабіць такое кіно, якое просіць душа. У такім, і толькі ў такім выпадку можна называць сябе мастаком, творцам.

У мастацкім жа плане Віктар Аслюк застаўся такім жа, якім быў дзесяць гадоў таму. Гэта аўтар-мінімаліст, які не церпіць найгранасці, пастановачных сцэн, выкарыстання закадравага тэксту, наватарскага мантажу ці нават музыкі. Дакументальнае кіно, на яго думку, мусіць быць максімальна набліжаным да рэальнасці, а не прыўкрашваць яе ці рабіць невыноснай. Амаль у кожным сваім фільме беларускі дакументаліст карыстаецца гэтым уласным негалосным маніфестам.

## Драўляная вёска

Вынікам пазначаных маральных і мастацкіх арыенціраў Віктара Аслюка стаў яго апошні фільм «Драўляны народ».



Віктар Аслюк

Старэнькі дзядуля ў густоўным гарнітуры і капелюшы прадзіраецца праз густое кустоўе з сякерай у руцэ, ссякае дрэўца і прыгаворвае: «Вось гэта на драўляны народ, на драўляны народ!» Жыхар Белавежскай пушчы Мікалай Тарасюк майструе з дрэва фігуркі людзей, расфарбоўвае іх і складае з іх кампазіцыі з вясковага жыцця і свету ўласных уяўленняў: вяселле, хаўтуры, сялянскія работы і святы, рамесніцкія заняткі вяскоўцаў і распяцце Хрыста. Жыццё заселеной і жывой драўлянай вёскі разгортваецца на дзядулевым падворку такім, якім яно напраўду ўжо не будзе ніколі; такім, якім яно засталося толькі ў памяці майстра. Мікалай Тарасюк — прыроджаны творца з асабістай філасофіяй мастацтва. І калі б патрапіў яму ў рукі пэндзаль — быць яму мастаком, але сродкам яго творчасці з дзяцінства стала сякера, з дапамогай якой майстра знаёміць нас з прыгажосцю вясковага жыцця.

Гледачу ж застаецца толькі ламаць галаву над пытаннямі без адказу: няўжо на нас перарвецца тая традыцыя, што яднала наш народ; няўжо мы асуджаныя існаваць без уласных этнічных каранёў і каштоўнасцяў; няўжо мы так і не вылучым аніякіх сэнсаў са спадчыны нашых продкаў; няўжо ўсё прыдбанае нашым народам, тое, што перадавалася з пакалення ў пакаленне, мусіць так і застацца ў дрэве?

Стары ж разьбяр, які ўсё яшчэ трымае ў памяці жывую вёску свайго дзяцінства, асуджаны застацца сам-насам з сабой выробленым драўляным народам.

ФОРУМ

# З ТЫФЛІСУ Ў ТБІЛІСІ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**З 18 па 25 кастрычніка ў Тбілісі адбываўся Міжнародны форум «Культура і літаратура на прасторы Паўднёвага Каўказу», у межах якога была праведзеная навукова-практычная канферэнцыя «Узаемапранікненне культур». Удзел у форуме ўзялі літаратары і навукоўцы з Грузіі, а таксама з Беларусі, Казахстану, Кыргызстану, Малдовы, Расіі, Узбекістану, Украіны.**



Фота Алены Осіпавай

Удзельнікі канферэнцыі каля кафедральнага сабору святой Тройцы ў Тбілісі

Асноўнай тэмай, што абмяркоўвалася цягам тыдня на знакамітай сваёй гасціннасцю грузінскай зямлі, быў білінгвізм краін постсавецкага блока, а таксама статус і значэнне рускай мовы ў гэтых краінах у нашы дні.

Тое, што культурная падзея з такой тэматыкай і праблематыкай адбылася менавіта ў Тбілісі, — невыпадкова і ў нечым знакава. Грузія — адна з тых постсавецкіх краінаў, дзе русіфікацыя, якую ў многіх рэспубліках спыніў развал СССР, зрабіла найбольшы «адкат». Праз 20 гадоў, паводле статыстыкі, толькі 70 000 жыхароў краіны называюць сябе рускамоўнымі, і ўсяго 200 000 грузінаў з 4,5 мільёнаў насельніцтва краіны ўвогуле валодаюць рускай мовай. У асноўным гэта людзі старэйшага пакалення. Моладзь зусім не размаўляе па-руску, выкарыстоўваючы ў якасці мовы міжнародных зносінаў англійскую ці нават нямецкую. Натуральная дэрусіфікацыя прабягае на фоне палітыкі Міхаіла Саакашвілі, знакамітага сваёй антырасійскай рыторыкай. Так што невыпадкова адной з першых пытанне пра захаванне рускай мовы




як мовы міжнародных зносінаў узняла менавіта грузінская творчая інтэлігенцыя. Ініцыятарамі і арганізатарамі форума выступіла Асацыяцыя рускамоўных літаратараў і дзеячаў культуры Грузіі «Новый современник». Форум быў падтрыманы Міждзяржаўным фондам гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаваў-удзельніц СНД.

Нацыянальная ідэнтычнасць жыхароў Грузіі амаль аднназначная. У адрозненне ад беларусаў ці жыхароў Усходняй Украіны, яны не называюць сябе рускімі, калі гэта не абумоўлена паходжаннем. Я — «чалавек рускай культуры», кажуць пра сябе рускамоўныя грузіны Грузіі. З іншага боку, павагу да рускай культуры дэманструюць і прадстаўнікі грузінскамоўнай большасці. Як сказаў падчас творчай сустрэчы стоўп грузінскай паэзіі Джансуг Чарквіяні (дарэчы, на беларускую мову яго бліскуча пераклаў Генадзь Бураўкін): «Расія для мяне — не таварыш Ленін, не Брэжнеў. Для мяне Расія — гэта Пушкін, Лермантаў, Ахмадуліна, Еўтушэнка. Палітыка тут ні пры чым». На форуме можна было пачуць аповеды аб тым, як на сёлетнюю забарону палітыка Георгія Цхакаі співаць у рэстарацыях Грузіі песні на рускай мове грузінская інтэлігенцыя адгукнулася серыяй вечароў бардаўскай песні і рускіх рамансаў...

На фоне варажнечы палітыкаў Расіі і Грузіі, ахвярамі якой робіцца ў выніку простыя грамадзяне (праблемы з авіяперавозкамі, цяжкасць у атрыманні візаў), — грузінскія культурныя эліты заяўляюць пра адсутнасць любой непрыязі і жаданне сябраваць і супрацоўнічаць з расійскімі калегамі. Вельмі сімвалічна, падкрэслівалі арганізатары форума, што падчас яго правядзення грузінскі каталікос — патрыярх Ілія ІІ выправіўся ў Маскву з візітам да маскоўскага патрыярха Кірыла.

«Мне цяжка ўявіць, што наступіць час, калі армянін, грузін і азербайджанец будуць дачыняцца па-англійску», — зазначыў Уладзімір Сарышвілі, адзін з арганізатараў форума. Так ці інакш, падсумавалі ў Тбілісі, на постсавецкай прасторы руская мова яшчэ доўгі час застанецца мовай міжнацыянальных зносінаў.

«Нам бы іх праблемы!» — маглі б сказаць беларусы, для якіх занапад рускай мовы ў Беларусі — тэма зусім не актуальная. Наадварот: у Беларусі, як ні прыкра, даводзіцца бараніць беларускую мову (у тым ліку ад афіцыйных уладаў). Але сацыяльныя і культурныя працэсы, якія адбываюцца ў Грузіі і Беларусі, шмат у чым падобныя. Беларусь на канферэнцыі прадстаўлялі Андрэй Хадановіч, які зрабіў даклад пра пераклады грузінскай паэзіі на беларускую мову, і Марыя Мартысевіч, якая асвятліла сітуацыю з білінгвізмам у сучаснай беларускай літаратуры. Як зазначае Хадановіч, «Грузія і Беларусь проста створаныя для бліжэйшага сяброўства і глыбейшых культурных кантактаў, а дзве "нацыі паэтаў" проста мусяць часцей і лепей перакладаць адна адну».

У межах форуму адбыліся таксама канцэрты, літаратурныя чытанні і экскурсіі па старажытных мясцінах грузінскай зямлі, а таксама па мясцінах Міхаіла Лермантава ды Аляксандра Грыбаедава — пісьменнікаў «таксама і грузінскіх» — перакананая прагрэсіўная інтэлігенцыя Грузіі. Вынікі першага (пробнага) мерапрыемства паказалі: у краінах былога СССР ёсць зацікаўленне аднаўляць культурныя сувязі на новым узроўні праз культурнае пасрэдніцтва рускай мовы. У заключэнні ўдзельнікі выказалі надзею, што такі запатрабаваны творчымі суполкамі розных краін праект і надалей будзе мець месца ў Грузіі — кропцы сустрэчы народаў і моваў, кропцы перасячэння культур і кантынентаў.

**Грузія — адна з тых постсавецкіх краінаў, дзе русіфікацыя, якую ў многіх рэспубліках спыніў развал СССР, зрабіла найбольшы «адкат»**

АБ'ЯВА

# «ВЫЯВЫ–2011: ТРОХМОЎЕ»

**7 снежня ў Музеі Янкі Купалы (вул. Я. Купалы, 4) адбудзецца мультыкультурны праект «ВЫЯВЫ–2011: ТРОХМОЎЕ» (Пераклады), прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча і 100-годдзя з дня нараджэння Чэслава Мілаша.**




У мерапрыемстве ўдзельнічаюць: літаратуразнаўца, укладальнік выдання «Максім Багдановіч: вядомы і невядомы» Ціхан Чарнякевіч; пісьменнікі, куратары і перакладчыкі 4-томнага выдання Чэслава Мілаша па-беларуску Андрэй Хадановіч і Марына Шода; аўтары і куратары праекта «Czeladnik czasu\Laiko pameistrys\Чаляднік часу» (Літва—Польшча—Беларусь); прадстаўнікі інтэрнэт-часопіса «ПрайдзіСвет» Юлія Цімафеева і Уладзя Лянкевіч, літаратары і перакладчыкі Віталь Рыжкоў і Анка Упала; рэжысёр і паэтэса Ганна Федарук, танцавальны дуэт «Алія Аціка», тэатр вогненнай імправізацыі «Асмігурд»; беларускамоўны trip-hop/downtempo гурт «B_SIDE».

Праект рэалізуецца пры падтрымцы дызайн-студыі pix.by/ і сайта kurs.by/.

Усім наведнікам у падарунак — унікальны дыск да трохгоддзя прома-групы ВЮ!

Вядучыя Віка Трэнас і Юлія Новік.

Пачатак у 18.00. Уваход па квітках у музей (3 000 руб.).

Кантакты: Віка Трэнас (аўтар праекта) +375 29 5607793, +375 29 1354495, e-mail: trenas007@gmail.com;vika-trenas.livejournal.com.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**Надзея — котка з яркай індывідуальнасцю.**



Надзея цудоўна ладзіць з іншымі жывёламі, любіць з імі гуляцца. Але гэта котка для тых, хто цэніць незалежнасць і самастойнасць. Надзея ўсё вырашае сама: і калі ласціцца, і калі спаць, і калі мурчаць, і калі гуляць.

Котка лаяльная да дзяцей. Латочак засвоіла на 5+.

Надзея будзе лепшым сябрам таму, хто гатовы аддаць ёй частку свайго сэрца і куточак у сваёй хаце.

Знаходзіцца на ператрымцы ў валанцёра прытулку «СуперКот».

Званіце: 8-029 6357203; 8-029 7577117 Надзея.

**Маша — сабака адданая ўсім сэрцам.**

Два гады таму ў Машы памёр гаспадар, і яна апынулася на вуліцы. Выжывала як магла. Галадала, бадзяжнічала, нараджала шчанюкоў, ужо пачынала дзічэць, калі яе нарэшце знайшлі валанцёры прытулку «СуперПёс». Машку накармілі і завялі ў цёплую хату. А яна скруцілася ў клубочак і спала без задніх лап ледзь не цэлы дзень.

І аказалася, што гэта абсалютна хатні, паслухмяны сабака. Ловіць кожны позірк гаспадара. Любую каманду Маша выконвае з першага разу і з радасцю. Ходзіць за валанцёркай хвастом, зазірае ў вочы, нібыта пытаецца: «Я ўсё правільна раблю? Я добры сабака? Ты мяне не выкінеш з хаты?»

Машы 4 гады, яна каля 55 сантыметраў. Добра ладзіць з дзецьмі і іншымі жывёламі.

Калі ў вашым жыцці не хапае адданага сябра, калі вы можаце падзяліцца сваім душэўным цяплом і кавалкам ежы, вазьміце яе ў свой дом. За Машу вы будзеце дзякаваць лёс і валанцёраў, якія яе знайшлі. Маша чакае Вас!

Званіце: 8-029-7755753 (Анастасія).



КАНЦЭРТ

# ВЯРТАННЕ ЛЕГЕНД БЕЛАРУСКАГА ГРАНЖУ

Мікіта БРОЎКА



**28 лістапада ў клубе «Графіці» выступілі беларускія гранж-гурты — «Happy Face» і «Голая Манашка».**

«Happy Face» сабраліся новым складам пасля працяглага перапынку, а лідар «Голай Манашкі» Федзя Жывалеўскі сёлета выйшаў з турмы пасля дзвюх з паловай гадоў зняволення.

Але пра «беларускія легенды гранжу» фанаты забыліся. Нават праз гадзіну пасля заяўленага пачатку вечара ў невялічкім «Графіці» былі занятыя толькі месцы за столікамі, і ўсяго некалькі чалавек глядзелі на выступ стоячы.

Але вядомыя асобы не пакінулі без увагі гэтую імпрэзу: сярод публікі нельга было не заўважыць Міхея Насарогава са скандальна вядомага «RockerJoker» і Аляксандра Памідорава, былі тут і калегі па гранж-сцэне — Яўген Змушка з гурта «МУТНАЕВОКА» і Раман Сухоцкі, вядомы па лідарству ў гуртах «KROK» і «Avias».

Вечар адкрываў незаяўлены ў афішы гурт «ВАК». Не ўразіўшы публіку, неўзабаве гурт сышоў, а за справу прыняліся вядоўцы — Ілля Маліноўскі і Аляксандр Памідораў. Пакуль тыя травілі байкі, «Happy Face» рыхтаваліся да выступу. А пасля не без кур'ёзаў адыгралі невялікі сэт. Публіка крычала «Брава!», а Міхей Насарогаў абураўся: «Брава» — гэта іншы гурт!» «Бравісіма!» — не разгубіўшыся, адгукнуліся фанаты. А тым часам мікрафоны выляталі са стоек, а дзяўчыны эратычна танчылі.

Нарэшце на сцэну выйшла «Голая Манашка». Першая песня аказалася новай, а пасля пайшла «класіка», але не без сюрпрызаў — была выканана не характэрная для гурта металічная песня, якая амаль нідзе раней не гучала. На жаль, сет гурта аказаўся маленькім, і шмат прызнаных гітоў публіка так і не пачула.

Бубнач «хэпіфэйсаў» Федзя Жывалеўскі заявіў пра скanчэнне канцэрту, палова публікі сышла, але шоў працягвалася. Федзя праспяваў некалькі песень пад гітару, а Аляксандр Памідораў падсеў за бубны. Гітара літаральна пайшла па руках. Яўген Змушка з гурта «МУТНАЕВОКА» заспяваў «Малінаўскі блюз». Эстафету хацеў пераняць і Аляксей «Мумрык» з «Happy Face», але не пашчасціла: медыятара для яго не знайшлося, а гаспадар гітары хутка забраў свой інструмент. На тым шоў скончылася.

Застаецца спадзявацца, што гэтыя безумоўна вартыя гурты ў хуткім часе зладзяць вялікія і багатыя па змесце канцэрты, якія не толькі не расчаруюць старых фанатаў, але і прыцягнуць новых.

ТБМ

# ПАВАГА ДА РОДНАЙ МОВЫ

**Прайшло ўжо больш за месяц ад XI з'езду грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». Як выконваюцца яго рашэнні журналісту «НЧ» Марату Гаравому распавёў старшыня ТБМ, вядомы беларускі грамадска-палітычны дзеяч і гісторык Алег Трусаў.**

— Галоўная ідэя з'езд — абвясціць наступны год Годам роднай мовы. З гэтай прапановай мы і звярнуліся да ўладаў. Прапанавана таксама зрабіць адзін з дзяржаўных тэлеканалаў цалкам беларускамоўным і перавесці не менш паловы праграм астатніх тэлеканалаў на родную мову. Дарэчы, Генадзь Давыдзька абяцаў, што цалкам беларускамоўны тэлеканал будзе створаны ўжо ў наступным годзе.

Акрамя таго, мы прапанавалі ўладам прыняць закон аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы. Прычым на з'ездзе былі прадстаўлены абедзве версіі праекта такога закона, распрацаваныя галоўным рэдактарам газеты «Наша слова» Станіславам Суднікам і мовазнаўцам Вінцуком Вячоркам. Па выніках з'езду створана пагадняльная камісія, якая павінна завяршыць сваю працу да канца года і накіраваць уладам канцэпцыю праекта закона. Мы дабіваемся, каб дзяржава выдзяляла неабходныя сродкі дзеля падтрымкі друкаваных і электронных выданняў на родную мове. Па прыкладу іншых двухмоўных краін, у тым ліку Ірландыі, неабходна стварыць асобны моўны дэпартамент пры прэзідэнце або пры Савеце міністраў, які будзе адсочваць ужыванне беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку чыноўнікамі. Рэалізацыя такіх захадаў дапаможа дабіцца пераходу ад засілля рускай мовы да рэальнага двухмоўя.

Да канца года мы павінны перакласці і ў пачатку наступнага года выдаць па-беларуску «Правілы дарожнага руху», дзеля чаго працуе вялікі калектыў грамадскіх актывістаў. У студзені 2012 года плануем адкрыць інтэрнэт-партал таварыства; рэалізаваць праект «Вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі праз валанцёрскую дзейнасць». У рамках гэтага праекта запланавана правядзенне конкурсу па гістарычных назвах, навуковай канферэнцыі, фальклорнага фестывалю, а таксама выданне календароў розных памераў з выявамі выбітных помнікаў айчыннага дойлідства. Акрамя таго, у межах гэтага праекту адбудуцца сустрэчы з мясцовымі валанцёрамі ў шэрагу гарадоў, у тым ліку ў Лагойску, Заслаўі, Мсціславе, Магілёве, Баранавічах і Лідзе.

Штогод пакрысе змяншаецца колькасць вучняў беларускамоўных школ. Аднак у гэтым годзе ўлады Гродзенскай вобласці разам з актывістамі ТБМ стварылі ў гарадах рэгіёна 20 беларускамоўных класаў. Нягледзячы на змяншэнне колькасці абітурыентаў, якія для тэставання выбіраюць беларускую мову, узровень іх ведаў лепшы, чым у выпускнікоў школ, якія здаюць рускую мову на іспытах. Беларуская мова стала вельмі папулярнай сярод моладзі. Пашырылася сфера ўжытку мовы ў перапісцы грамадзян з чыноўніцтвам, у рэкламе і на транспарце, і, што асабліва важна, у галіне культуры, дзякуючы беларускамоўнаму міністру Паўлу Латушка. Трэба ўлічваць і тое, што да ўлады прыходзіць новае пакаленне чыноўнікаў, якія ведаюць нацыянальную гісторыю і культуру, добра валодаюць роднай мовай.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1216

Падпісана да друку 02.12.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.